Комуністычная партыя (большэвікоў) Беларусі

ЗВЯЗДА

Орган ЦК і МК КП(б)Б, ПВК і СНК БССР

САКАВІК 14 СЕРАДА 1934 г. № 57 (4890)

Год выдання XVII

Пролетарыі ўсіх краін, злучайцеся!

СЁННЯ Ў НУМАРЫ

АРТЫКУЛЫ: ПЕРАДАВЫЯ—ЗРАБІЦЬ 1934 ГОД ГОДАМ ПЕРАЛОМУ Ў ЖЫВЁЛАГАДОЎЛІ. МАГУТНЫ РЫЧАГ ПАВЫШЭННЯ ЎРАДЖАЙНАСЦІ КАНАПЕЛЬ **В. ВОЛЬСКІ** — АБ НАШАЙ ДРАМАТУРГІІ. **АКЦІПЕНКА, СТЫРНЕ** — УЛІЧЫЦЬ УРОКІ ІЛЬНАПЕНЬКАЗАГАТОВАК

ЗНІШЧАЛЬНІКІ ЖЫВЁЛЫ НА ЛАВЕ ПАДСУДНЫХ.
СУСТРЭЧА КАНЬКАБЕЖЦАЎ СССР З ЧЭМПІОНАМІ СВЕТУ.
ЗА МЯЖОЙ:
АНТЫФАШЫСЦКАЯ БАРАЦЬБА ВА ФРАНЦЫІ.
БУЙНАЯ ПЕРАМОГА ФРАНЦУЗСКАЙ КОМПАРТЫІ.

ЗРАБІЦЬ 1934 ГОД ГОДАМ ПЕРАЛОМУ Ў ЖЫВЁЛАГАДОЎЛІ

XVII з'езд партыі і тав. СТАЛІН далі вычарпальныя ўказанні аб ліквідацыі нашага адставання ў жывёлагадоўчай гаспадарцы. Гэтыя ўказанні набываюць асаблівае значэнне ва ўмовах БССР, якая з'яўляецца адным з асноўных жывёлагадоўчых раёнаў Саюза.

У той час калі па Совецкаму Саюзу ў 1933 годзе размеры змяншэння пагалоўя дайшлі да мінімума, а ў свінагадоўлі вызначыліся прызнакі ўздыму, то ў радзе раёнаў БССР і за апошні год мы мелі значны ўпадак жывёлагадоўлі.

Для прыкладу спынімся на некалькіх найбольш характэрных раёнах.

КАСЦЮКОВІЧЫ — буйнейшы жывёлагадоўчы раён у Беларусі. У гэтым раёне за другую палову 1933 г. знішчана больш адной пятай стада рагатай жывёлы і свіней. Такое-ж становішча назіраецца і ў ВЕТЦЫ, адным з асноўных свінагадоўчых раёнаў. За апошні год стада рагатай жывёлы тут скарацілася на 23 проц., а па свінях яшчэ больш.

Па БЫХАЎСКАМУ раёну за 10 месяцаў 1933 года свінае пагалоўе зменшылася на 10.400 галоў, а рагатая жывёла — на 3.700.

Тав. СТАЛІН, з усёй большэвіцкай рэзкасцю абрушыўся на зямельныя органы за тое, што яны не падымалі трывогу за лёс жывёлагадоўлі, усяляк замазваючы недахопы і ўтойваючы часта ад партыі і дзяржавы сапраўднае становішча справы.

Такія-ж адносіны да жывёлагадоўлі мы мелі і ў БССР не толькі з боку зямельных органаў, але ў радзе раёнаў і з боку кіруючых партыйных і совецкіх арганізацый.

У студзені кіраўнікі Касцюковіцкага райкома партыі і райвыканкома на раённай партыйнай канферэнцыі апярэдзілі лічбамі аб прыросце пагалоўя за 1933 год, у той час калі на фермах ішоў масавы забой жывёлы, калі ў раёне за 1933 г. стада зменшылася больш чым на 20 проц.

Зразумела, што гэта ўтойванне сапраўднага становішча прытупіла пільнасць усёй партыйнай арганізацыі мас калгаснікаў і працоўных аднаасобнікаў. Гэта прывяло да таго, што нават у першыя два месяцы 1934 года знішчэнне стада прадаўжалася, забой маладняка не спыняўся.

Выкананне пастаўленай перад намі партыяй задачы — зрабіць 1934 г. годам пералому да ўздыму ва ўсёй жывёлагадоўчай гаспадарцы — РАШАЕЦЦА СЕННЯ НА КАЛГАСНЫХ ФЕРМАХ, СКОТНЫХ ДВАРАХ, У ГАСПАДАРЦЫ КОЖНАГА КАЛГАСНІКА, КОЖНАГА ПРАЦОЎНАГА АДНААСОБНІКА.

Па БССР зараз пачаліся масавыя ацёлы і апаросы. ЗАХАВАННЕ І ГАДОЎЛЯ ЎСЯГО МАЛАДНЯКА З'ЯЎЛЯЕЦЦА ПЕРШАЯ УМОВАЙ ДЛЯ СТВАРЭННЯ ПЕРАЛОМУ Ў ЖЫВЁЛАГАДОЎЧАЙ ГАСПАДАРЦЫ ЎЖО Ў ГЭТЫМ ГОДЗЕ. Сігналы, якія мы маем з месц паказваюць, што зямельныя органы, мясцовыя, совецкія і партыйныя арганізацыі яшчэ не зразумелі, што без большэвіцкай барацьбы за захаванне і гадоўлю кожнага цяляці і кожнага парасяці — усякія разважанні аб разгортванні жывёлагадоўлі ёсць пустая балбатня.

Мы павінны неадкладна дабіцца змянення забою і падзежу маладняка. Трэба, нарэшце, канчаткова знішчыць існуючую да апошняга дня на многіх фермах абязлічку і купацкую ўраўнілаўку. Лепшыя праверэныя калгаснікі-ударнікі павінны быць замацаваны за фермамі. Здзельшчыну і натуральнае прэміраванне трэба ўвесці ва ўсіх фермах. Рашаючае значэнне для захавання маладняка мае цёплы, сухі, добра прыстасаваны свінарнік і цялятнік.

Пры агульным нездавальняючым кіраўніцтве жывёлагадоўляй асабліва закінутым участкам аказалася жывёлагадоўля калгаснікаў і аднаасобнікаў. Гэта ў той час, калі ў калгаснікаў і аднаасобнікаў знаходзіцца большая частка жывёлы.

Іменна на гэтым участку больш за ўсё ідзе знішчэнне жывёлы і маладняка. Таму асаблівае значэнне набывае ініцыятыва раду МТС (РАГАЧОЎСКАЙ, БОЛЬШЭВІЦКАЙ), якія арганізавалі заключэнне дагавораў паміж калгасамі і калгаснікамі на захаванне маладняка. Калгасы гэтых МТС аказваюць калгаснікам усякую дапамогу ў справе гадоўлі маладняка. Гэта ініцыятыва павінна быць неадкладна падхоплена ўсімі раёнамі БССР. Увесь прыплод ад ацёлу і апаросу жывёлы, якая знаходзіцца ў карыстанні калгаснікаў, трэба поўнасцю захаваць.

«Лявацкае» ігнараванне жывёлагадоўлі аднаасобнікаў патурае купацкай агітацыі за забой жывёлы. Разгортваннем масавай і растлумачальнай работы мы павінны дабіцца ўздыму жывёлагадоўлі і па аднаасобнаму сектару.

Для далейшага аднаўлення стада рашаючае значэнне набывае правядзенне ў гэтым годзе злучной кампаніі. Даволі сказаць, што на фермах БССР напічваецца 22.000 ялавых кароў і 24.000 ялавых свінаматак. У рэзультаце злачыннай бяздзейнасці Наркамзема і раённых арганізацый, план злучной першага квартала 1934 года выканан усяго толькі на 12,7 проц. Зямельныя органы, як і раней, толькі падлічваюць процант ялавасці, але нічога не робяць для таго, каб прыкаваць да гэтага ўвагу старшынь калгасаў, загадчыкаў ферм, скотнікаў.

КІРАЎНІКІ ЗЯМЕЛЬНЫХ ОРГАНАЎ ПАВІННЫ РАЗ НАЗАЎСЁДЫ ЗАПОМНІЦЬ, ШТО ЯЛАВАСЦЬ ГЭТА ТОЙ-ЖА ЎБОЙ І ЗА ЗРЫЎ ЗЛУЧНОЙ, ЯНЫ БУДУЦЬ ТАКСАМА АДКАЗВАЦЬ, ЯК І ЗА ЗРЫЎ ПАСЕЎНАЙ.

Буйнейшае значэнне набывае зараз стварэнне моцнай кармовай базы. Трэба [illegible] і памагаць пачынанню раду калгасаў, якія, не паспабляючы ўвагі да зерневых культур, імкнуцца забяспечыць у севазваротах наяўнасць кармовага кліну. Але гэтага мала. Трэба па настаўшаму ўзяцца за арганізацыю пугавой гаспадаркі. Трэба ўзяць калгасныя масы і працоўных аднаасобнікаў на барацьбу за добрую культурную сенажаць, культурны выпас.

Рэйд друку па праверцы выканання рашэнняў з'ездаў партыі аб жывёлагадоўлі, пачаты па ініцыятыве палітвіраўніцтва МТС НКЗ СССР і «Социалистического земледелия», павінны ўскалыхнуць усю грамадскасць, масы калгаснікаў і працоўных аднаасобнікаў на барацьбу за большэвіцкую рэалізацыю ўказанняў XVII з'езда партыі і тав. СТАЛІНА па далейшаму разгортванню жывёлагадоўлі.

«Няма чаго даказваць, што совецкія людзі, браўшыя не адну сур'ёзную перашкоду на шляху да мэты, здолеюць узяць і гэту перашкоду». (СТАЛІН).

Магутны рычаг павышэння ўраджайнасці, канапель

Пастанова СНК СССР і ЦК ВКП(б) «АБ МЕРАХ К РАЗВІЦЦЮ КАНАПЛЕВОДЧАЙ ГАСПАДАРКІ», надрукаваная ва ўчарашнім нумары «Звязды», мае надзвычай важную гаспадарча-палітычнае значэнне. Важнасць яе заключаецца ў тым, што яна ўзнімае на яшчэ большую вышыню барацьбу за павышэнне ўраджайнасці канапель—адной з важнейшых тэхнічных культур. Асабліва важным момантам лічыцца тое, што пад гэту барацьбу падводзіцца моцная матэрыяльная зацікаўленасць калгасаў, калгаснікаў і працоўных аднаасобнікаў у развіцці пасеву канапель.

Згодна пастановы калгасы, калгаснікі і працоўныя аднаасобнікі, пасеўшыя канопліі на сядзібных, прысядзібных і пойменных угоддзях і выканаўшыя свае абавязацельствы па здачы пяньку дзяржаве вызваляюцца ад абавязковых паставак бульбы і здачы дзяржаве, гароднімы на тую колькасць гектараў, якая будзе засеяна канаплямі на пералічаных у пастанове угоддзях.

Апрача таго, падвойваюцца нормы продажы хлеба і павышаюцца нормы продажы алею і мануфакты па цэнах дзяржаўных цэнах калгасам, калгаснікам і працоўным аднаасобнікам, здаючым дзяржаве пяньку і насенне канапель.

Надзвычай важная льгота прадаставяцца калгаснікам, добрасумленна працуючым на мочцы, сушцы і мяцці пяньку. За дзённую норму выпрацоўкі гэтым калгаснікам залічваецца два працодні.

У БССР, дзе пасевы канапель займаюць даволі значную плошчу (У ГЭТЫМ ГОДЗЕ 30 ТЫСЯЧ ГА) гэтыя льготы павінны адыграць вялікую ролю ў справе павышэння ўраджайнасці канапель і паляпшэння якасці пяньку-валакна. Гэта тым больш важна, што ўраджайнасць канапель у нашай рэспубліцы за апошнія гады была яўна нездавальняючай, прытым штогод знізалася. КАЛІ Ў 1930 ГОДЗЕ СЯРЭДНЯЯ ЎРАДЖАЙНАСЦЬ З ГА КАНАПЕЛЬ СКЛАДАЛА 3,6 ЦЭНТНЕРА ПЕНЬКІ-ВАЛАКНА І 3,9 КАНАПЛЕНАСЕННЯ, ТО Ў 1932 ГОДЗЕ СЯРЭДНЯЯ ЎРАДЖАЙНАСЦЬ ПЯНЬКІ-ВАЛАКНА раўнялася ўжо 3,5 цэнтнера і канопляснасенню—3,1 цэнтнера, а ў 1933 годзе ўраджайнасць знізілася па валакну да 3,2 цэнтнера і насенню—да 2,8 цэнтнера з га.

Асноўнай прычынай такой нізкай ураджайнасці,—як гэта зусім правільна адзначылі СНК БССР і ЦК КП(б)Б у сваёй пастанове аб кантрактацыі тэхнічных культур,—з'яўляецца змяншэнне пасеву канапель па старых канаплянішчах і прысядзібных участках.

Вось чаму абавязак рабінных партыйных арганізацый, совецкіх, зямельных і ільнапеньказагатоўчых органаў (асабліва КАСЦЮКОВІЦКАГА, ЧЫРВОНАПОЛЬСКАГА, КАРМЯНСКАГА, МАЗЫРСКАГА, ЖЛОБІНСКАГА, ЛЮБАНЬСКАГА РАЁНАЎ, дзе пасевы канапель найбольш пашыраны)—зараз-жа давесці пастанову СНК СССР і ЦК ВКП(б) аб мерах к развіццю канаплеводчай гаспадаркі да кожнага калгаса, калгасніка і працоўнага аднаасобніка, растлумачыўшы ім гаспадарча-палітычнае значэнне гэтай пастановы як для іх саміх, так і для краіны ў цэлым. РАСТЛУМАЧАЛЬНАЯ РАБОТА ПАВІННА БЫЦЬ ЦЕСНА ЗВЯЗАНА З ПРАВОДЗІМАЙ ЗАРАЗ КАНТРАКТАЦЫЯЙ ТЭХНІЧНЫХ КУЛЬТУР І ЗАВЯРШЭННЕМ ІЛЬНОПЕНЬКАЗАГАТОВАК.

Трэба прама сказаць, што ў радзе месц (ЛЕПЕЛЬ, ЧАШНІКІ і інш.) пасеў канапель пічаць другарадная справай, забываючы пра дырэктыву СНК БССР і ЦК КП(б)Б, якая «АБАВЯЗВАЕ РВК, СЕЛЬСОВЕТЫ І ПРАЎЛЕННІ КАЛГАСАЎ ДА ВЯСНЫ 1934 ГОДА ВЫЛУЧЫЦЬ ПАД ПАСЕВЫ КАНАПЕЛЬ СТАРЫЯ СЯДЗІБНЫЯ І ПРЫСЯДЗІБНЫЯ КАНАПЛЯНІШЧЫ... А/ ТАКСАМА ЗЯМЕЛЬНЫЯ ЎЧАСТКІ З-ПАД КАНЮШЫНІШЧАЎ, ДОБРА ЎГНОЕНЫЯ».

БССР мае ўсе магчымасці не толькі поўнасцю засеяць устаноўленую ўрадам і партыяй плошчу пад канопліі, але і значна перакрыць яе. Трэба толькі энергічна ўзяцца за падрыхтоўку да сяўбы і яе правядзенне.

Усесаюзнае спаборніцтва калгасных брыгадзіраў

БАЯВЫМ СПАБОРНІЦТВАМ, ЧЭСНАЙ РАБОТАЙ ЗАВАЮЕМ МЕСЦА НА ЧЫРВОНАЙ ДОШЦЫ ПЕРАДАВІКОЎ

Адказваем на заклік курэкінцаў

З ПІСЬМА БРЫГАДЗІРАЎ КАЛГАСА ІМЯ ФАЛЬКО.

Мы, брыгадзіры, калгаса ІМЯ ФАЛЬКО і калгасны актыў, сабралі ся на нараду абгаварыць выклік калгасных брыгадзіраў МІЛАСЦЬ-КУРАКІНСКАЙ МТС.

Што і казаць, правільна гаворыць брыгадзіры і вялікі каштоўныя для далейшай нашай работы прапановы ўносяць яны. Гэта-ж факт, што ад нас, ад таго, як мы расставім свае сілы, установім працоўную дысцыпліну, будзе залежаць поспех работы брыгады і калгаса ў цэлым. Правіль на пішуць куракінцы ў сваім пісьме аб тым, што «вялікая адказнасць кладзецца на нас, калгасных брыгадзіраў. Нам даверана машыны і сельскагаспадарчыя прылады. Пад нашым кіраўніцтвам знаходзяцца калгаснікі, мы ў першую чаргу адказваем за якасць работы».

Мы прымаем выклік брыгадзіраў Міласць-Куракінскай МТС і вітаем іх ініцыятыву. Па іх прыкладу мы разгортваем социалістычнае спаборніцтва паміж брыгадамі і ўнутры брыгад нашага калгаса.

Наш лозунг — своечасова і добраякасна правесці веснавую сяўбу. На правядзенне ў жыццё гэтага лозунга мы мабілізуем усіх калгаснікаў і калгасніц.

Коні нашы ў большасці сваёй сярэдняй сытасці, але ёсць у нас і слабаватыя коні. За тэты прамежак часу, што застаўся да сяўбы, мы абавязуемся падмацаваць нашых коняй. Ужо зараз значна палепшан корм. 15 сакавіка мы яшчэ раз праверым гатоўнасць коняй да сяўбы. Праверым становішча браніраваных кармоў, як выконваюцца правілы догляду, правільнасць кармлення і рацыянальнае скарыстанне кармоў.

Звяртаемся да нашых жанчын, каб яны, па прыкладу ударніц Баш макоўскай МТС, сшылі-б для нашых коняй торбачкі і зрабілі папоны, каб улетку днём не заядалі іх мухі ў полі, і каб ноччу яны не мёрзлі.

Мы парашылі яшчэ раз праверыць, у якім становішчы знаходзіцца насенне, ці добра адсартавана яно, якую мае ўсхожасць. Яшчэ раз прагледзім увесь сельска-гаспадарчы інвентар.

У бліжэйшыя дні мы скончым зімовую вывазку гною.

Высокі ўраджай—гэта высокая рабочая дысцыпліна. Гэта правільная расстаноўка людзей, каб кожны ведаў сваё месца на рабоце. Мы павінны зараз-жа паглядзець, каб у нашай калгаснай сям'і не было ўрода—подыра і прагульшчыка. Гультай гэта скула на нашай шыі. Ад гультая трэба пазбавіцца як ад чумы.

Вялікае значэнне мае калгасная сямейка. Вопытныя калгаснікі могуць даць шмат каштоўных прапаноў, як лепш правесці сяўбу. Вось чаму мы зараз па ўсіх брыгадах арганізоўваем збор калгасных прапаноў па лепшай падрыхтоўцы і правядзенню веснавой сяўбы. Лепшая прапанова будзе прэміравана.

Мы лічым, што сяўбу капусавых у гэту весну трэба правесці не больш як за 12 а ўсіх яравых за 23 дні.

На нашых палях ва многіх мясцах поўна камення і пырніку. Як толькі растане снег, мы прыступаем да ачысткі палёў. На гэту справу мы арганізуем піянераў і школьнікаў. Сабранае каменне ў нашай гаспадарцы спатрэбіцца для будаўніцтва. У нізкіх мясцах, дзе вясной доўга стаіць вада, мы парашылі пракопаць канавы і прарабіць раўчакі.

Мы, як і брыгадзіры Міласць-Куракінскай МТС, патрабуем ад трактарнай брыгады, каб яна мела планграфік работы як трактарнай, так і паляводчай брыгад. Калгасная брыгада павінна добра ведаць, калі на яе ўчастак прыходзіць трактар і як і што ён будзе рабіць. За ўчастак адказвае калгасная брыгада, брыгадзір. І ён павінен патрабаваць ад МТС своечасовай дапамогі, кантралюючы работу трактароў.

Мы прапануем зараз разгарнуць па раёну дзейнасці нашай МТС КОНКУРС НА ЛЕПШУЮ БРЫГАДУ, па лепшай падрыхтоўцы і правядзенні веснавой пасеўнай кампаніі. Са свайго боку выклікаем на спаборніцтва калгасы «Другая пяцігодка» і «Ленінскі шлях». Арбітрам спаборніцтва выбіраем газету «УДАРНІК КАЛГАСНЫХ ПАЛЕЎ».

Мы прапануем разгарнуць конкурс на лепшую брыгаду па ўсіх МТС БССР. Просім Палітсэктар МТС абвясціць гэты конкурс, а рэдакцыю газеты «Звязды» быць арбітрам усебеларускага спаборніцтва і арганізаваць на старонках газеты дошку гонару лепшых брыгад, якія даюць лепшыя паказальнікі ў барацьбе за большэвіцкую сяўбу.

Пісьмо падпісалі брыгадзіры і калгасны актыў:

Фота К. ІНСАРАВА (САЮЗФОТА).

У калгасе «Новы перакоп» (Крым) уся плошча яравой сяўбы поўнасцю забяспечана насеннем, ачышчаным на трыеры і пратручаным фармаліном.

НА ЗДЫМКУ: старшыня калгаса т. Манжылаў і брыгадзір паляводчай брыгады т. Харэнка пратручваюць фармалінам насенне ячменю

ЗАСЕЕМ ЗА 15 ДЗЁН

ЛЕПЕЛЬ, 13. (па тэлефону ад нашага карэспандэнта).

Палітаддзелам першай Лепельскай МТС праведзен злёт калгасных брыгадзіраў, які абгаварыў выклік брыгадзіраў Міласць-Куракінскай МТС і пастанавіў уключыцца ва ўсесаюзнае спаборніцтва калгасных брыгадзіраў.

Брыгадзіры Лепельскай МТС аба вязаліся правесці сяўбу ўсіх культур за 15-18 дзён. Злёт выклікаў на спаборніцтва брыгадзіраў другой Лепельскай і Ушацкай МТС.

Нехамкін.

КОМУНІСТЫ НА ЧАЛЕ СПАБОРНІЦТВА

ГОМЕЛЬ, 13 (па тэлеграфу).

Гомельскі гарком партыі, палітаддзел МТС і горсовет у сувязі з заклікам міласць-куракінскіх брыгадзіраў абавязалі ўсіх комуністаў і комсамольцаў узначаліць социалістычнае спаборніцтва ў часе падрыхтоўкі і правядзення веснавой сяўбы. Заклік міласць-куракінскіх брыгадзіраў і перадавы артыкул «Праўды» будуць абмеркаваны ва ўсіх брыгадах.

Пры горсавеце створана конкурсная камісія, вызначаны лепшыя якасныя паказальнікі па сяўбе і развіццю жывёлагадоўлі. Для прэміравання лепшых брыгад, брыгадзіраў і калгаснікаў выдзелена пяць радыёўстановак, 10 пуцёвак у дамы адпачынку, 13 нікелевых ложкаў, 10 парасят і племянны вытворнік.

Рэдактар «Палескай праўды» БУГРОЎ.

АРШАНСКІЯ БРЫГАДЗІРЫ ВЫШЛІ НА СПАБОРНІЦТВА

(Ад аршанскага карэспандэнта „Звязды")

Выпускнікі курсаў калгасных брыгадзіраў пры Аршанскай МТС уважліва выслухалі пісьмо брыгадзіраў Міласць-Куракінскай МТС. Заўтра выпускнікі пойдуць у свае калгасы, каб узначаліць брыгады ў барацьбе за пасяховае правядзенне веснавой сяўбы.

Калі пісьмо было зачытана, разгарнуліся гарачыя спрэчкі.

Брыгадзір калгаса «Перамога» тав. Парчаўскі асаблівую ўвагу аддаў пытанню пастаяннага складу брыгад, матэрыяльнай зацікаўленасці іх.

— Куракінцы пішуць праўду. Возьмем к прыкладу наш калгас. Не ўсё яшчэ ў нас у парадку са складам брыгад, з прымацаваннем да іх зямельных участкаў. У разультаце, у нас вось ужо чацверты год авёс сеюць па аўсу, няправільна размяркоўваюць паміж замельнымі ўчасткамі калгасны гной. З трактарамі не лепш. Яны ў мінулым годзе не выконвалі сваіх планаў, ды і дакладных планаў не было. Усё гэта нам трэба ўлічыць.

На аснове абгаварэння пісьма брыгадзіраў Міласць-Куракінскай МТС выпускнікі-брыгадзіры, улічыўшы асаблівасці свайго раёна, паставілі перад сабой задачу дабіцца ў будучым годзе павышанай ураджайнасці: па жыту не менш 10,2 цэнтнера, па пшаніцы 11,5, па ячменю 12, па аўсу 11, па бульбе 120 цэнтнераў.

Каб забяспечыць такі ўраджай, выпускнікі абавязаліся арганізаваць на правесці веснавую сяўбу не больш як за 18-20 дзён, закончыць уздым папару пад жыта ў маі і правесці рад іншых практычных мерапрыемстваў.

Асобныя брыгадзіры ў выступленнях вызначылі канкрэтныя паказальнікі па сваіх брыгадах. Тав. Шутоў з калгаса «Чырвоныя ўсходы»:

— Маючы на ўвазе тое, што ў маёй брыгадзе ўсё поле заяблена, вывезен гной, коні ў добрым стане, падрыхтавана па 10 га кампосту, мы можам узяць з гектара пшаніцы 13 цэнт., аўса — 12, ячменю — 13 цэнт. Каб забяспечыць такі ўраджай, мы з першых жа дзён сяўбы будзем праводзіць штодзенна кароткія вытворчыя нарады, збіраць каштоўныя рацыяналізатарскія прапановы калгаснікаў.

Аналагічныя самаабавязацельствы ўзялі на сябе брыгадзіры Кандраценка (Чырвоны Берег), Селькоў (6 з'езд Совецтваў), Бендзерава, Гаранькоў, Чарняўскі, Балотнікава і інш.

У заключэнне выпускнікі пастанавілі: заўтра-ж у сваіх калгасах сабраць брыгады і далажыць ім як аб пісьме чорнаморскіх брыгадзіраў, так і аб сваіх самаабавязацельствах.

Асаблівая ўвага была аддана пытанню аб планаванні работы брыгад.

Заўтра ўсе аграномы МТС выязджаюць у сельсоветы, з тым, каб на месцы ў калгасах памагчы старшыням і калгасным рахункаводам і брыгадзірам закончыць работу па планаванню калгаснай вытворчасці.

Выпускнікі-брыгадзіры заключылі паміж сабою дагавары на социалістычнае спаборніцтва і выклікалі наследаваць іх прыкладу ўсіх брыгадзіраў Аршанскага раёна.

Менскі раён выканаў план вывазкі гною

Менскі раён на 10 сакавіка 1934 года выканаў план зімовай вывазкі гною. Вывезена 189511 возаў або 100,8 проц. Працягваем далейшую вывазку. Горсовет.

Пастанова ЦК і СНК аб Данецкай чыгунцы— праграма дзеянняў усяго чыгуначнага транспарта

Развіць большэвіцкую самакрытыку

ГОМЕЛЬ, 13 (Па тэлефону). Сёння па ўсіх зменах рабочых і ІТР станцыі Гомель была абгаворана пастанова ЦК ВКП(б) і СНК СССР аб рабоце Данецкай чыгункі. Сходы аднадушна адзначылі гістарычнае значэнне гэтай пастановы.

Саставіцель паязду тав. Сільвонаў, стрэлачнікі Пінчук і Рэмізевіч, дзяжурны па ст. Гомель Майсейчык узялі на сябе рад абавязацельстваў па забеспячэнню выразнай работы сваіх вытворчых участкаў.

Абгаварэнне пастановы ЦК СНК праведзена таксама ў паравозным і вагонным дэпо.

СУСІМОВІЧ.

АД РЭДАКЦЫІ. Як відаць з інфармацыі тав. СУСІМОВІЧА, пры абгаварэнні пастановы ЦК і СНК аб рабоце Данецкай дарогі ў Гомелі дапушчана вялікая памылка. Арганізатары прапрацоўкі пастановы не скарысталі гэта для ўзняцця рашучай большэвіцкай самакрытыкі па вылучэнню аналагічных паказаным ў пастанове недахопаў у сябе, на сваёй станцыі. Гэта трэба ўлічыць пры далейшай прапрацоўцы пастановы ва ўсіх дэпо, станцыях і дыстанцыях чыгунак БССР.

АНТЫФАШЫСЦКАЯ БАРАЦЬБА ВА ФРАНЦЫІ

ПАРЫЖ, 12. (БЕЛТА).

Па ўсёй Францыі расшыраецца адзіны фронт антыфашысцкай барацьбы. Рабочыя разганяюць фашысцкія сходы і ствараюць антыфашысцкія камітэты. У Напце адбылася арганізаваная комуністамі пяцітысячная антыфашысцкая дэманстрацыя.

Не гледзячы на адмаўленне рэфармісцкіх правадыроў дэманстраваць сумесна, у дэманстрацыі прымалі ўдзел социалістычныя рабочыя і члены рэфармісцкіх профсаюзаў. Дэманстранты агалашалі лозунгі — «Няхай жывуць советы», «Кіппа ў турму».

БУЙНАЯ ПЕРАМОГА ФРАНЦУЗСКАЙ КОМПАРТЫІ НА МУНІЦЫПАЛЬНЫХ ВЫБАРАХ

ПАРЫЖ, 12. (БЕЛТА).

У Дрансі (дэпартамент Сены), дзе мэрам быў социяліст, на частковых муніцыпальных выбарах компартыя атрымала 4.199 галасоў, радыкалы 795, неасоцыялісты 418. У 1929 г. компартыя сабрала ў Дрансі 2.273 галасы. У дэманстрацыі, якая адбылася пасля аб'яўлення рэзультата, рабочыя абвясцілі аб сваім пераходзе на бок компартыі. Сярод дэманстрантаў раздаваліся выгукі: «Советы ўсюды», «Няхай жыве компартыя».

АДОЗВА ФРАНЦУЗСКІХ ПІСЬМЕННІКАЎ І ВУЧОНЫХ

72 віднейшых вучоных і пісьменнікаў (Ралан, праф. Ланжэвен, акад. Дэвібруль і інш.) заклікаюць у друку працоўную інтэлігенцыю Францыі да барацьбы супроць фашысцкай пагрозы ва Францыі.

«Нашай першай справай, — гаворыцца ў звароце, — будзе стварэнне «камітэта пільнасці», які падпарадкуе сваю дзейнасць, дзейнасці рабочых арганізацый».

ШОФЕРЫ ПАРЫЖА ЗНОЎ БАСТУЮЦЬ

З прычыны адмаўлення прадпрыемцаў выканаць умовы, на якіх была закончана забастоўка шофераў таксі, 25 тыс. шофераў аднавілі забастоўку.

КОМДЭПУТАТУ РОЖЭКУ ПАГРАЖАЕ ВЫЛАЧА СУДУ

Соймавая камісія зацвердзіла рашэнне пракурора выдаць суду комуністычнага дэпутата Рожэка. Пытанне аб выдачы Рожэка будзе разбірацца ў пленарным пасяджэнні сойма.

КЛАСАВЫЯ БАІ У ІСПАНІІ

МАДРЫД—ВАЕННЫ ЛАГЕР

ЛОНДАН, 12. (БЕЛТА).

Увесь друк публікуе паведамленне Рэйтэра з Мадрыда, якое характарызуе становішча Іспаніі, як становішча «перад пачаткам грамадзянскай вайны». З раніцы вуліцы Мадрыда патруліруюцца атрадамі конной паліцыі. Банкі, тэлефонныя станцыі і дзяржаўныя ўстановы ахоўваюцца.

СТАЧКІ ПАШЫРАЮЦЦА НА УСЮ КРАІНУ

Хваля забастовак быстра ахватвае правінцыю. У Валенсіі забаставалі чыгуначнікі. У Каталоніі шырыцца рух за выступленне пролетарыята Каталоніі для падтрымання пролетарыята Мадрыда.

У Барселоне стала выходзіць газета «Комбато», орган профсаюзаў, які парваў з анархісцкім кіраўніцтвам з прычыны яго апазіцыі адзіному фронту. Урад устанавіў суровую цэнзуру. Пастановай судовых улад распушчана анарха-сіндыкалісцкая нацыянальная канфедэрацыя працы.

У Мадрыдзе пачалася ўсеагульная забастоўка друкароў, да якой далучыліся ўсе прадаўцы газет. Не выйшаў нават афіцыяльны ўрадавы орган. Забастоўка будаўнікоў і металістаў прадаўжаецца, не гледзячы на арышт кіраўнікоў.

ПАЧАЛАСЯ ЎСЕАГУЛЬНАЯ СТАЧКА

ЛОНДАН, 12. (БЕЛТА).

У паведамленнях з Іспаніі ўказваецца на пашырэнне стачачнага руху. У Сеговіі, Аліканце і ў радзе іншых гарадоў пачалася ўсеагульная стачка.

У Мадрыдзе стачка друкароў ахапіла амаль усе друкарні. Карэспандэнт «Морнінг пост» паведамляе, што фашысцкая газета «Эль дэбатэ» была адпраўлена сёння на вакзал, пад аховай узмоцненага наряду паліцыі, узброенай кулямётамі.

Той-жа карэспандэнт паведамляе, што ўрад арыштаваў стачком будаўнікоў, але затым вызваліў яго, баючыся, што арышт прывядзе да ўсеагульнай стачкі.

У прыгарадах Мадрыда праведзены напады на харчовыя магазіны. Дэманстранты прабавалі так сама спыніць трамвайны рух, закідаючы вагоны камнямі.

ПАРЫЖ, 12. (БЕЛТА).

Як паведамляе «Юманітэ» з Мадрыда, іспанскі ўрад прымусіў друкароў друкарні ваеннага міністэрства выпусціць афіцыяльны орган «Газета дэ Мадрыд». Пумары газеты прадаюцца толькі ў паліцэйскіх участках. Частка тыражу захвачана бастуючымі і спалена. Многа арыштаў. Работнікі друкарань ваеннага і марскога міністэрстваў, якія не лічацца на ваеннай службе, далучыліся да стачкі.

КОМПАРТЫЯ НА БАЯВЫМ ПАСТУ

Арыштавана многа комуністаў. Комуністычны друк забаронены. Хоць урад афіцыяльна не абвяшчаў аб роспуску компартыі, прынятыя супроць яе меры прывялі да таго, што компартыя фактычна на нелегальным становішчы. Аднак, компартыя і рэволюцыйная профанапазіцыя арганізуюць забастовачны рух.

Арганізацыя социалістычнай моладзі распушчана, у сувязі з тым, што масы гэтай моладзі далучыліся да адзінага фронта, кіруемага компартыяй і комсамолам.

У Алкоі, не гледзячы на забарону губернатара, 3 тыс. рабочых прынялі ўдзел ў пахаванні рэволюцыйнага актывіста. Паліцыя адкрыла агонь па ўдзельніках пахавальнай працэсіі і цяжка ранила работніцу. Аб'яўлена ўсеагульная стачка.

У Валенсіі шырыцца стачка транспартнікаў. З Більбао паведамляюць аб уцёках з турмы 10 палітзняволеных.

2-ХДЭКАДНІК ЗАГАТОВАК І ВЫВАЗКІ ЛЕСУ

У Сіроцінскім раёне парушаюць дагавор з калгасамі

Сіроцінскі раён сістэматычна не выконвае плана лесавывазкі: на 1 сакавіка план выканан па загатоўках дроў на 50,7 і па вывазцы на 50,32 проц.

У чым-жа справа? Што з'яўляецца прычынай такога ганебнага адставання? Асноўная прычына заключаецца выключна ў бюракратычных метадах кіраўніцтва, пачынаючы з райлеспрамгаса да нізавога звяна — эксплаатацыйнага ўчастка.

Вось, напрыклад—Станіслаўскі эксплаатацыйны ўчастак. Паводле плана гэты ўчастак павінен быў вывезці лесу-строю 16 тыс. кбм., а вывезена ўсяго 8.672 кбм., што складае 50,8 проц. Дроў па плану трэба было вывезці 17 тыс. кбм., а вывезена ўсяго 6.009 кбм., што складае 34,9 проц.

Як-жа рэагуе на гэтыя справы кіраўніцтва ўчастка. Прараб Піраноў і намеснік дырэктара Сагаловіч зусім не цікавяцца работай, на самым участку рэдка бываюць, прасліся з класава-варожымі элементамі, самі падрываюць працоўную дысцыпліну, п'янствуюць.

Сістэматычна зрываецца выкананне дагавораў з калгасамі і аднаасобнікамі. Зусім не выпадковае з'явішча—гэта затрымка з разлікамі і выплатай за вывазку лесу на году-два і больш. Вось, напрыклад, калгас «Светач» не можа атрымаць ужо цэлы год прылічаныя яму за вывазку 300 руб. Калгасу «Рассвет» лесаўчастак яшчэ з мінулага года павінен 500 руб., калгасу «Другая пяцігодка» 300 руб., калгасу «Новае Кузьміно» 350 руб., і раду іншых калгасаў і аднаасобнікам.

Справай разліку з рабочымі і наогул улікам усёй работы займаецца дзелавод участка Шчарбак—сын былога кулака і белагвардзейскага афіцэра.

Лепшыя ўдарнікі не заахвочваюцца. Між тым для прэміравання лепшых возчыкаў выдзелен спецыяльны фонд, які дагэтуль не выкарыстан.

Ніякай грамадска-выхаваўчай работы на ўчастку не праводзіцца. Матэрыяльна-бытавыя ўмовы рабочых вельмі нездавальняючыя. У сталовай, дзе харчуюцца рабочыя, заўсёды брудна, цесна. Сталовая і кухня змешчаны ў невялічкай хаце, дзе жыве і сам загатчык. Кухня знаходзіцца ў антысанітарным становішчы.

Такіх фактаў работы палосбных эксплаатацыйных участкаў у Сіроцінскім раёне не мала.

Зрыўшчыкі лесавывазкі павінны быць неадкладна прыцягнуты да адказнасці.

І. КАЛТУНОЎ.

Злучылі, разлучылі, зноў злучылі

На прыкладзе работы Віцебскага леспрамгаса — аднаго з буйнейшых леспрамгасаў БССР — можна прасачыць, як трэст Лесбел кіруе сваімі нізавымі звеннямі і зма гацца за ліквідацыю прарываў.

Віцебскі леспрамгас сарваў выкананне плана лесазагатовак за 4 квартал 1933 года і зрывае выкананне плана першага квартала 1934 года.

Леспрамгасам кіруе т. Гарэлік, ён-жа і загатчык сплаўнай канторы. Гэта становішча адмоўна ўплывае на работу леспрамгаса. Справа ў тым, што участкі гэтых двух кантор былі раскіданы па пяці раёнах, што не дало магчымасці наладзіць аператыўнае кіраўніцтва.

Чаму-ж так атрымалася?

Яшчэ ў снежні 1933 года кіраўніком трэста Лесбел т. Шапіра быў выдан загад аб зліцці леспрамгаса з сплаўканторай. Адразу-ж было пабудавана памяшканне для двух кантор. Праз некаторы час Лесбел перадумаў. Рашана было пакінуць гэтыя канторы асобнымі адзінкамі. Прайшоў яшчэ месяц і абвяшчаюць зноў аб зліцці.

Гэты «рэарганізацыйны» перыяд зрывае выкананне плана лесазагатовак і вывазак. Трэст Лесбел узяў апартуністычную стаўку на зніжэн не плана і знізіў бабінавіцкаму ўчастку план на 23 тыс. кбм. загатоўкі і вывазкі.

Вельмі дрэнна кіруюць і астатнія сектары Лесбела. Кіраўніцтва ОРС'а Лесбела зусім не снабжае рабочых, якія працуюць па зімовай аплотцы і загатоўцы рэквізіта На сплаўных участках — Бешанковіцкім і Лучэскім — рабочыя не атрымліваюць прадуктаў ужо больш 2 месяцаў.

Л. Стэрлін.

ПАТУРАЮЦЬ САБАТАЖНІКАМ ЛЕСАВЫВАЗАК

Любаньскі раён зрывае двухдэкаднік лесавывазкі. Яшчэ дагэтуль не мабілізованы падводы. На лесавывазку ўсяго выехала 298 падвод.

У затопленым месцы ляжыць 800 кбм. фанеры, дуба і ясеня. Не вывезен экспартны хваёвы піловачнік і 9.000 кбм. дроў. Раённыя арганізацыі гэтым пытаннем зусім не цікавяцца. РВК абмежаваўся тэлеграмай усім старшыням сельсавета.

Складзеныя пратаколы на злосных сабатажнікаў лесавывазкі ляжаць у райсудзе не разгледжанымі. Самі работнікі леспрамгасаў на ўчасткі непасрэдна не выязджаюць, а сядзяць у канторах. Тэхнік Рэдэк за 2½ месяцы работы загатовіў усяго 80 кбм. дроў і даў 50 кбм. браку. Рабачком леспрамгаса ніякіх мер не прымае. Старшыня рабачкома Берковіч цэлымі тыднямі не з'яўляецца на ўчастак.

Асабліва дрэнна працуюць па лесавывазцы Нежынскі сельсавет, выканаўшы план на 27 проц., Слабодскі сельсавет—46 проц., і Рэчынскі—46 проц.

С. Герасімовіч.

У ГАСЦЯХ У МАСКОЎСКІХ РАБОТНІЦ

(АД СПЕЦЫЯЛЬНАГА КАРЭСПАНДЭНТА „ЗВЯЗДЫ")

Ветліва сустрэла Масква беларускіх гасцей — дэлегацыю лепшых калгасніц-ударніц БССР. Тут 1 старшыня калгасаў, брыгадзіры, загатчыкі фермамі і радавыя ўдарніцы социялістычных палёў.

Першыя прывітанні і віншаванні са святкаваннем 8 сакавіка дэлегацыя атрымала ад Паліткіраўніцтва Наркамзема СССР у асобе нам. начальніка Паліткіраўніцтва тав. Пятруніна.

А потым? Вы хочаце ведаць, як нашы калгасніцы правялі час, як яны разам з маскоўскімі работніцамі адсвяткавалі міжнародны жаночы дзень? Адкрыйце блок-нот старшыні калгаса «Чырвоная сосенка», Полацкага раёна, тав. Сабаленкі. Ён вам пра ўсё раскажа. Тав. Сабаленка рабіла спецыяльныя запісы, для таго, каб потым падзяліцца са сваімі таварышамі, з кім яна разам будуе заможнае жыццё ў калгасе.

Першыя старонкі блок-нота гавораць:

«У дзень прыезду пасля добрага смачнага абеду нас запрасілі ў рэдакцыю «Социалистическое земледелие». Тут мы з работнікамі газеты падзяліліся нашым вопытам у барацьбе за большэвіцкі калгас, за калгаснае заможнае жыццё. Выступала я, Марына АТРОШКА, з калгаса імя Варашылава, Менскага раёна, тав. БЕСАЛЫГА з калгаса «Чырвоны колас», Слуцкага раёна, БАГДАНАВА з калгаса «Першы май», Гарадоцкага раёна, старая ўдарніца калгаса «Ударнік», Барысаўскага раёна, тав. ДУБЕНЬ і інш.

Кожны з нас падрабязна расказаў, як мы рыхтаваліся да сустрэчы веснавой сяўбы. Тав. Атрошка расказала аб тым, што на іх ферме ёсць 30 дойных кароў і 16 цялят, калгас зараз будуе новы скотны двор. У мінулым годзе ў калгасе было 22 кані, а зараз 29. Бескароўных у калгасе няма, нават тыя гаспадаркі, якія ўступілі ў калгас у гэтым годзе, таксама абзавяліся цёлкамі.

Я асабіста гаварыла аб тым, што наш насенны фонд мы тры разы прапусцілі праз трыер і сартыроўку. Усё насенне праверылі на ўсхожасць. Усхожасць аўса — 97 проц., ячменю—98 проц., насення бульбы—на ўсе 100 проц. Коні ў нас таксама сярэдняй сытасці.

Я добра запомніла словы тав. Чарвякова, які перад нашым ад'ездам даў нам наказ — гаварыць не толькі аб поспехах, але і аб недахопах, крытычна падыходзіць да нашых поспехаў, асабліва ў пытаннях падрыхтоўкі да веснавой сяўбы і разгортвання жывёлагадоўлі.

Вось я і расказала, што адзін калгаснік у нас зарэзаў цялё і мы гэта вялікае злачынства на агульным сходзе рашылі разгледзіць та варыскім судом. Гэта на таварыша вельмі падзейнічала. Абяцаў адкупіць цялё і выкарміць яго на славу. Сваё абяцанне выконвае.

Тав. Бесалыга, з калгаса «Колас», скардзілася на дрэнную работу сельскай кааперацыі. «У нас, — гаворыць тав. Бесалыга, — кааперацыя працуе так дрэнна, што нават лампы і шкла і то не дастаць».

Гутарку мы закончылі выступленнем тав. Дубень.

Яна расказала аб тым, як калгаснікі будуюць сваё заможнае жыццё. У кожнай гаспадарцы ёсць куры, гусі, парасяты. Коні адкормлены, што называецца. Зернавых калгаснік атрымаў на працадзень па 4 і бульбы па 8 кгр. Амаль кожны калгаснік абзавёўся новай мэбляй».

Далей, у блок-ноце запісана:

—Вечарам, 7-га сакавіка нашу дэлегацыю запрасілі ў госці работніцы цэнтральнага маскоўскага тэлеграфа. Ох, і прынялі-ж нас гасцінна. мяне і тав. Дубень нават запрасілі ў прэзідыум ўрачыстага вечара ад нашай дэлегацыі. Мы перадалі ім гарачае прывітанне ад работніц і калгасніц Совецкай Беларусі. Сказалі ім, што мы ўжо не забітыя, непісьменныя батрачкі, а раўнапраўныя з мужчынамі актыўныя ўдзельніцы социялістычнага будаўніцтва. Падзякавалі іх за тую дапамогу, якую аказвае нам пролетарыят Совецкага Саюза і ў першую чаргу маскоўскія рабочыя.

З вялікай увагай мы слухалі выступаўшых таварышоў, якія расказвалі аб цяжкім жыцці працоўных жанчын у капіталістычных краінах, аб іх барацьбе за сваё вызваленне ад ярма капітала.

Пасля ўрачыстага вечара ў перапынку нас пакармілі добрай вячэрай і мы разам з работніцамі пашлі плясаць. Яны — «рускую» а мы «лявоніху», а потым разам і тое і другое. Ох, і весела было нам. Вельмі спадабалася паказаная нам п'еса «Ненавісць». Як гасцям, нам адвялі першыя рады.

Некалькі лістоў блокнота прысвечаны 8 сакавіка.

— У гэты дзень — запісала т. Сабаленка, — днём нас запрасілі ў рэдакцыю «Крестьянской газеты», дзе таксама прысутнічалі работнікі журнала «Колхозный бригадир». Як і ў «Соц. земледелии» мы тут таксама расказалі аб нашым калгасным жыцці-быцці. Гутарка наша прадаўжалася некалькі гадзін, пасля чаго нас, што называецца, на славу ўгасцілі.

Вечарам наша дэлегацыя разбілася па тры часткі. Частка дэлегацыі пашла на ўрачысты пленум Маскоўскага совета. Другая — да работніц «Трехгорки», астатнія таварышы пашлі к работніцам Фрунзеўскага раёна.

Я асабіста пашла ў «Большой театр» на пленум, бачыла т. т. Крупскую і Ульянаву, а таксама і старую маці тав. Дзімітрава. Тав. Нікалаева зрабіла даклад аб дню 8 сакавіка. Пасля ўрачыстай часткі быў нам паказан вялікі канцэрт.

Цяжка мне перадаць, якое ўражанне зрабіла ўсё гэта на мяне. Яно застанецца ў мяне на ўсё жыццё ў памяці. Адно скажу, што ў жыцці не марыла я папасці ў Маскву, ды яшчэ ў самы «Большой театр» і толькі дзякуючы совецкай уладзе я аказалася такой шчаслівай.

Весела правялі час і другія таварышы. Вялікімі клопатамі і любоўю акружылі нашых калгасніц работніцы «Трехгорки» і Фрунзеўскага раёна. Разам з імі нашы калгасніцы весяліліся, пелі розныя песні, разам і вячэралі.

9 сакавіка заняў у блок-ноце самую вялікую колькасць спісаных лістоў. Пачынае тав. Сабаленка так:

—Пасля добрага сытнага абеду ў паліткіраўніцтве Наркамзема наша дэлегацыя пашла на шарыка-падшыпнікавы завод імя Кагановіча, куды нас запрасілі работніцы гэтага завода. Мы дэтальна аглядзелі амаль усе працэсы вытворчасці. Былі ў рамонтным, кавальскім, аўтаматорна-такарным, тэрмічным і другіх цэхах. Спецыяльна прымацаваныя к нам інжынеры і тэхнікі падробна тлумачылі нам кожны працэс, кожную аперацыю.

Асабліва, што мне і маім таварышам кінулася ў вочы — гэта вялікая колькасць жанчын, якія працуюць непасрэдна ля варштата. Тут і жанчыны-такары, слесары, шліфавальшчыкі і нават у кавальскім цэху, напрыклад, на гарачай штампоўцы калец таксама працуюць жанчыны. Нам потым сказалі, што з 14.000 усіх працуючых на заводзе 6.000 складаюць жанчыны. Цэхі светлыя, чыстыя, усюду пануе ўзорны парадак. Тут на заводзе мы па-настаяшчаму пераканаліся ў тым, што такое большэвіцкая працоўная дысцыпліна, што такое социялістычнае спаборніцтва і ўдарніцтва. Мы абавязкова гэту ўзорную социялістычную дысцыпліну перанясем да нас у калгасы, на нашы палі.

Пасля абеду мы былі ў маўзалеі Леніна. Ва ўсіх у нас на вачах з'явіліся слёзы пры відзе тав. Леніна, які ляжыць у грабу.

Вечарам наша дэлегацыя агледзела Цэнтральны Дом Чырвонай арміі, чырвонаармейскую выстаўку. Асабліва нам спадабалася галярэя грамадзянскай вайны Пасля агляду нам паказалі гукавы фільм і зноў угасцілі добрай вячэрай.

Апошнія лісты блок-нота прысвячаюцца апошняму дню прабывання дэлегацыі ў Маскве. «10-га чысла дэлегацыя правяла таварыскую гутарку з намеснікам начальніка Паліткіраўніцтва Наркамзема СССР тав. Пятруніным. Тут выказваліся амаль усе нашы калгасніцы. Тав. Пятрунін пасля ўважлівых запытанняў аб нашым калгасным жыцці заклікаў нас да баявой падрыхтоўкі к сяўбе, да ажыццяўлення лозунга тав. Сталіна — зрабіць калгасы большэвіцкімі, а калгаснікаў заможнымі».

У гэты-ж дзень уехалі дамоў, уехалі гатовымі к баявой сустрэчы вясны другой социялістычнай пяцігодкі.

ТЫЯ, ШТО „ПРАВАРОЧВАЮЦЬ НЕ ДРЭННА"

Аб цэнтральным праўленні саюза рабочых скурана-абутковай прамысловасці загадчык культаддзела ЦСПСБ тав. Рубінштэйн заявіў:

— Яны праварочваюць не дрэнна справу з соцтэхэкзаменам.

Падрыхтоўкай к соцтэхэкзамену на прадпрыемствах скурана-абутковай прамысловасці ахоплена 1.852 рабочых, што складае не больш 25 проц. усіх працуючых. З іх здавала тэхэкзамен 415 чалавек, здала на «выдатна» 99.

Такая невялікая колькасць здаваўшых тэхэкзамен тлумачыцца абсалютна нездавальняючым ўзроўнем тэхвучобы. На фабрыцы імя Кагановіча заняткі гурткоў праводзяцца адзін раз у тыдзень ку на працягу 30 мінут. На фабрыцы «Праца» гурткі па аўладанню тэхнікай працуюць нерэгулярна, адсутнічае работа на замацаванню ведаў гурткоўцаў.

Гурткі па аўладанню тэхнікай не забяспечаны літаратурай і адпаведнымі падручнікамі. Белшчаціна разаслала сваім прадпрыемствам з ведама ЦП праграму ФЗВ для заняткаў гуртка.

Пры здачы соцтэхэкзамена звычайна прад'яўляюцца патрабаванні, якія адносяцца не толькі да тэарытычных ведаў. Адначасова патрабуецца поўнае выкананне колькасных і якасных паказальнікаў промфінплана.

Гэта не можа не быць вядомым профарганізацыям прадпрыемстваў і самому ЦП. Аднак, яцэйка ЗОТ і заўком завода «Большэвік» намецілі выдаць значкі «ЗОТ» 13 чал., на якіх няма вестак аб выкананні якасных паказальнікаў. Цэнтральнае праўленне праштампавала гэта зусім няправільнае рашэнне заводскіх арганізацый.

Па запэўненнях працаўнікоў ЦП, на «Большэвіку» для «выдатнікаў» арганізован спецыяльны гурток для далейшай тэхвучобы. На самой-жа справе нічога падобнага няма.

Першы і апошні раз да сучасна га моманту ЦП абгаварвала пытанне аб соцтэхэкзамене 13 студзеня. Быў заслуханы даклад культработніка. Праўленне вымушана было канстатаваць, што большасць фабзаўкомаў амаль не звяртаюць увагі правядзенню соцтэхэкзамена. Потым следвалі агульныя пункты, кожны з якіх паслядоўна прапануе: разгарнуць, папулярызаваць, арганізаваць, прыняць і т. д. і т. д.

Асабіста для слабе цэнтральнае праўленне ніякіх вывадаў не зрабіла. У пачатку студзеня ў Віцебску быў член прэзідыума ЦП тав. Шахавіцкі. У сваім дакладзе ЦП ён адзначыў, што фабком фабрыкі імя Лекерта не аддае ўвагі правядзенню соцтэхэкзамена. Прайшлі два месяцы, а ЦП не ведае, што робіцца на фабрыцы. На віцебскім шчоткамбінаце к часу наведвання яго Шахавіцкім было 9 «выдатнікаў», паводле-ж вестак ЦП праз месяц колькасць іх... зменшылася да 8.

У ЦП лічаць, што на фабрыцы імя Кагановіча ёсць «безумоўны ярух». Палепшэнне яны, відаць, бачаць у тым, што падрыхтоўкай да здачы тэхэкзамена ахоплена ўсяго 18,4% усіх рабочых. Як піша фабрычная газета, «наведванне тэхвучобы як было, так і асталося крэпным. Курсы майстроў таксама працуюць дрэнна. Бюро ІТР ніякага ўдзелу ў палепшэнні справы тэхвучобы не прымае. Арганізацыя ЗОТ толькі пачынае афарміляцца». Недарма газета пытае: «Дырэкцыя, фабком! Што вы зрабілі для ліквідацыі прарыву 1933 года ў справе асвоєння тэхнікі рабочым».

Наўрад ці трэба пасля гэтага гаварыць аб цане запэўненняў ЦП, аб тым, як яно кіруе важнейшай справай здачы соцтэхэкзамена.

Цэнтральнае праўленне саюза рабочых скурабутковай прамысловасці павінна забяспечыць штодзённае аператыўнае кіраўніцтва правядзеннем соцтэхэкзамена, і прыйсці да ўсебеларускага злёта зноў ужо з найлепшымі паказальнікамі.

МІХАЙЛАЎ.

Фота ЛОСЕВА

На шэйнай фабрыцы «Сцят Інд устрыялізацыі» (Віцебск) шырока разгарнулася тэхнічная вучоба рабочых, у выніку не фабрыцы палепшылася якасць выпускаемай прадукцыі і палепшыліся паказальнікі па выкананню плана.

НА ЗДЫМКУ: вывучэнне пацельнай машыны пад кіраўніцтвам механіка фабрыкі т. Шырахаева ў цэху пашыўкі пальтаў.

В. ВОЛЬСКІ

АБ НАШАЙ ДРАМАТУРГІІ

(Некалькі думак і заўваг да з'езда ССПБ)

Тэатр недарма лічыцца самым моцным і самым даступным сродкам ідэйна-мастацкага ўздзеяння на масы. На тэатральнай сцэне дзейнічае не толькі слова — як у літаратуры, не толькі гук — як у музыцы, не толькі фарба — як у малярыцтве. Сцэнічнае мастацтва — у першую чаргу мастацтва жывога чалавека. На тэатральнай сцэне дзейнічае перад глядачом жывы чалавек.

Тэатральны спектакль прымушае гледача пераживаць разам з дзеючымі асобамі, спачуваць ім, страдаць, любіць, ненавідзець. Моцны і працяжны ўплыў тэатра і таму зусім зразумела, чаму так настойліва імкнуліся ўвесь час нацыянал-дэмакраты выкарыстаць тэатр у сваіх шкодніцкіх контрреволюцыйных мэтах.

Нацдэмы заўсёды разглядалі тэатр у якасці ўдзячнага сродку сваёй палітычнай дзейнасці, у якасці сродку распаўсюджвання буржуазна-нацыяналістычных уплываў на масы. Яшчэ ў дарэволюцыйны час, стварачы драматычныя гурткі амаратараў, беларускія нацыяналісты лічылі актыўны ўдзел у рабоце гэтых гурткоў абавязковым для кожнага «шчырага беларуса адраджэнца». Шмат намаганняў накіроўвалі яны на тое, каб апанаваць створаны Окцябрём дзяржаўны тэатры БССР, каб, ператварыўшы іх уачагі нацыяналістычнай прапаганды, выкарыстаць тэатральнае мастацтва ў якасці аднаго са сродкаў сваёй падрыўной дзейнасці на карысць капіталістычнай рэстаўрацыі ў БССР.

Большэвіцкая партыя ўшчэнт зруйнавала здрадніцкія планы нацдэмаў, сарвала з іх фальшыванацыянальную маску, выкрыла да канца сапраўдны твар нацыяналістычнай контрреволюцыі.

Рабочы клас БССР пад кіраўніцтвам комуністычнай партыі нанёс рашаючы ўдар нацыянал-дэмакратызму Контрреволюцыйная агентура беларускага кулацтва была выкінута з культурна-асветных устаноў, а разам са сваімі гаспадарамі і катаўніцамі, разам з усім іншым нацдэмаўскім ахвосцем быў выкінут з беларускай совецкай сцэны і контрреволюцыйны буржуазна-нацыяналістычны рэпертуар.

На змену разбітай і выкінутай нацдэмаўскай драматургіі прышлі новыя драматычныя творы, прасякнутыя ідэямі пролетарскага інтэрнацыяналізма, прасякнутыя пафасам социялістычнага будаўніцтва. Прышлі новыя аўтары, высунутыя з радоў рабочага класа. Замест антысовецкіх «перлаў» нацдэмаўскай драматургіі, замест шавіністычнага псеўда-гістарычнага агульна-нацыянальнага героя («Кастусь Каліноўскі»), замест нацыяналістычнай рамантыкі і рэакцыйнай ідэалізацыі феадальнага мінулага («Вір», «Скарына сын з Полацку» і інш.), замест «изощренной» стылізацыі вобразаў народнай цемры і забабонаў («Апраметная») на сцэне беларускіх совецкіх тэатраў з'яўляюцца творы, рыхтуючыя на беларускім матэрыяле барацьбу за социялістычнае будаўніцтва.

Кіруючае значэнне гэтай новай драматургіі забяспечыла і паспяховую перабудову тэатраў, забяспечыла ім новы змест, новую ідэйную накіраванасць.

Не меншыя па свайму значэнню рэзультаты выклікалі на беларускай сцэне і лепшыя творы революцыйнага рэпертуара братніх совецкіх рэспублік, пастаноўкі якіх яшчэ зусім нядаўна з пенай на вустах, але дарэмна імкнуліся перашкодзіць нацыянал-дэмакраты. Нарэшце, на тэатральнай сцэне БССР з'яўляюцца ў крытычнай інтэрпрэтацыі лепшыя творы сусветнай класічнай спадчыны.

Распе, мацнее і шырыцца фронт беларускай совецкай драматургіі. Бурнаму росту беларускай совецкай драматургіі, выкліканаму небывалымі перамогамі социялізма, асабліва спрыяла гістарычная пастанова ЦК ВКП(б) ад 23 красавіка 1932 г. аб перабудове літаратурна - мастацкіх арганізацый. Гэта пастанова ліквідавала тое напружанае становішча, якое стварылася ў літаратуры і асабліва на ўчастку драматургіі, у выніку абмежавання групавых і «заязджацельскіх» метадаў БелАПП'аўскага кіраўніцтва.

Пастанова ЦК адразу ўнесла яснасць ва ўсе асноўныя пытанні развіцця літаратуры і мастацтва ў першую чаргу, у пытанні творчага метада, высунуўшы на першы план у якасці асноўнай праблемы — **неабходнасць узмоцненай барацьбы за высокую ідэйна - мастацкую якасць творчай прадукцыі.** Гэта быў першы моцны штуршок, які выклікаў узмоцненую творчую актыўнасць у галіне драматургіі.

Услед за гэтай пастановай асабліва моцным стымулам для далейшага буйнага росквіту драматургіі ў БССР паслужыла правядзенне, не маючага яшчэ гістарычных прэтэндэнтаў, дзяржаўнага конкурса на лепшы драматургічны твор, абвешчаны СНК Саюза ССР. Тая ўвага пытанням драматургіі, якую прадэманстраваў правядзеннем гэтага конкурса ўрад Совецкага Саюза, тое значэнне, якое зусім недвухсэнсова надалі драматургіі, як найбольш складанаму і дзейнаму віду літаратурнай творчасці кіруючыя органы партыі (даволі хоць-бы прыгадаць вядомыя словы тав. Сталіна аб тым, што **«драматургія — гэта тое звяно, ухапіўшыся за якое мы зможам выцягнуць увесь ланцуг літаратуры»**), рашуча пакончылі з не даацэнкай драматургіі. Нельга таксама абыйсці тых плённых мерапрыемстваў, якія былі ўзняты і праведзены кіраўніцтвам Аргкамітэта совза совецкіх пісьменнікаў. У выніку ажыццяўлення гэтых мерапрыемстваў вакол драматургіі стварыліся надзвычай спрыяючыя ўмовы.

Правядзенне дзяржаўнага конкурса на БССР дало беларускай літаратуры каля 70 п'ес (у тым ліку «Сімфонія гневу» **Шашалевіча**, «Сымон Карызона **Зарэцкага**, «Канец дружбы» **Крапівы**, «Великодушие» **Галаўчынера**, «Маці» **Гурскага**, «Начпалітаддзела» **Глазырына** і шмат іншых), вывела беларускую совецкую драматургію на належнае месца сярод іншых відаў літаратуры. Удзельная вага драматургічнага сектара ў беларускай совецкай літаратуры за апошні час у параўнанні з недалёкім мінулым, надзвычай павысілася. Правядзенне дзяржаўнага конкурса стымуліравала ў шырокім маштабе прыцягненне да працы ў галіне драматургіі буйных прадстаўнікоў іншых літаратурных жанраў «Напор. Александровіча «Бацькаўшчына» Чорнага, «Ваяна да пабеднага канца» Я. Купала). У выніку дзяржаўнага конкурса беларуская совецкая драматургія атрымала, напрыклад, п'есу ад празаіка М. Зарэцкага «Сымон Карызна». Шырока вядомы і папулярны сярод працоўных мас БССР сатырык і байкапісец Крапіва ўпершыню выступіў на конкурсе з сур'ёзнай праблемнай п'есай «Канец дружбы». Нарэшце, конкурс выклікаў да жыцця, творы новых, да гэтага часу невядомых, упершыню выступаючых з уласнай літаратурнай прадукцыяй, аўтароў (Глазарын «Начпалітаддзела»), узняў з нізоў, выклікаў да актыўнай творчай дзейнасці новыя маладыя кадры з гушчаў працоўных мас.

Паспяхова перамагаючы класаварожыя ўплывы, перамагаючы сваё адставанне ад тэмпаў социялістычнага будаўніцтва, беларуская совецкая драматургія ўпэўнена ўзнімаецца на вышэйшы ідэйна-мастацкі ўзровень. Пашыраецца творчы дыяпазон драматурга. Паглыбляецца ідэйна-філасофская значымасць тэм і сюжэтаў.

Беларуская совецкая драматургія пачынае ставіць і вырашаць (з большай або меншай сілай мастацкай перакананасці, але пераважна з ідэйна-правільных пазіцый) адказнейшыя праблемы социялістычнага выхавання мас. Яна пачынае ставіць і вырашаць на канкрэтным матэрыяле складанейшыя праблемы новай социялістычнай маралі, падвяргаць крытычнаму перагляду старыя этычныя нормы, пановаму і смела падыходзіць да старога разумення такіх адцягненых катэгорый, як «дружба», «абавязак», «гонар» і т. д.

Хіба, скажам, «Бацькаўшчына» не з'яўляецца станоўчым прыкладам функцыянальнага значэння драматургіі ў справе выканання вялікіх, сусветнагістарычных на свайму значэнню задач другой пяцігодкі?

Або возьмем, напрыклад, п'есу Крапівы «Канец дружбы», якая на фоне паспяховага выкрыцця ідэйнай і класавай сутнасці эпігонаў «прышчепаўшчыны», гіпучых пад пераможным націскам социялізма, дае магчымасць аўтару на-новаму паставіць і вырашыць праблему дружбы. «Што такое дружба?» — пытаецца аўтар вускамі аднаго з сваіх герояў і знаходзіць на гэта пытанне выстарчальны, глыбока прадуманы і ўсвядомлены адказ. «Дружба трымаецца на супольнасці класавых інтарэсаў» — вось лагічны вывад, да якога прыходзіць аўтар. «Няправільна будзе, калі скажу: ён мой друг, а таму ўсё добра робіць; трэба сказаць: ён усё добра робіць і таму ён мой друг. І калі яшчэ дагаварыцца аб тым, што разумець пад словам «добра», то будзе ўсё ясна». Гэтыя словы аднаго з персанажаў Крапівы, якія з'яўляюцца фактычна лейт-матывам усяго твору, сведчаць адначасова і аб значных зрухах у светапоглядзе аўтара, аб выразным наближэнні яго да пазіцый пролетарскай ідэалогіі.

Надзвычай цяжка, дый заўчасна пісаць аб п'есах, якія пакуль што яшчэ не надрукаваны, або не паставлены на сцэне, бо зусім відавочна, што яны могуць яшчэ прайсці праз неадпаразовы перагляд і дадатковыя апрацоўкі з боку аўтара. Але тым не менш, і цяпер ужо можна адзначыць, што п'еса «Маці» І. Гурскага сведчыць, напрыклад, аб бясспрэчным росце і ўдасканаленні аўтара ў параўнанні з яго ранейшымі творамі.

У аснову гэтай п'есы пакладзена імкненне аўтара абязброіць і аб вергнуць буржуазна-нацыяналістычны міф аб нібыта бясклассавай суцэльнасці беларускай нацыі, ускрыць сапраўдную класавую сутнасць беларускага нацыянал-дэмакратызма на этапе яго бутафорскай «дзяржаўнасці», гэта значыць у перыяд стварэння здрадніцкай, хоць і ідэўгавечнай, чынгасці і, нарэшце, бясслаўнай гібелі ўрада БНР.

Прычым аўтар прабуе дабіцца ажыццяўлення пастаўленай перад сабой мэты (на пытанні аб тым, у якой ступені аўтару гэта ўдалося, трэба спыніцца асобна і больш падрабязна) шляхам выкарыстоўвання і выкрыцця звычайнай сістэмы сімвалічных вобразаў, уласцівых нацдэмаўскай літаратуры.

Аб пашырэнні творчага дыяпазона драматургіі БССР за кошт інтэрнацыянальнай тэматыкі, аб паспяховым перамаганні правяшчыльнай абмежаванасці сведчыць п'еса В. Галаўчынера «Великодушие», набудаваная на гістарычным матэрыяле або гераічных днях Парыжскай Камуны. Для нашай драматургіі становіцца характэрнымі выразныя тэндэнцыі да адлюстравання і выяўлення амаль усіх асноўных працэсаў, якія разгортваюцца ў краіне Советаў, да імкнення эмацыянальна ўзброіць глядача на далейшую барацьбу за канчатковую перамогу социялізма. Асабліва трэба адзначыць у якасці аднаго з найбольш істотных дасягненняў, што наша драматургія шчыльна пачынае падыходзіць да станоўчага стварэння ў асобных творах жыццёвага і пераканальнага вобраза героя нашых дзён, большэвіка, будаўніка социялізма.

Але нароўні з агромным ростам нашай драматургіі мы павінны адзначыць і пэўныя, часам даволі складаныя труднасці. Гэта — труднасці росту. Адна з асноўных труднасцяй крыецца ў складаным і адказным характары тэматыкі, узятай непасрэдна з рэальнай сапраўднасці нашай непаўтарымай эпохі, з социялістычнай практыкі рабочага класа, у неабходнасці арганічнага аўладання яе філасофскай глыбінёй, правільнага раскрыцця і выяўлення вядучых тэндэнцый яе дыялектычнага развіцця адпаведна моцнымі сродкамі мастацкай пераканальнасці.

Высокі ідэйны ўзровень большасці драматычных твораў не можа нам закрыць вочы на значнае адставанне іх у галіне фармальна-тэхнічных якасцяй. Архітэктоніка значнай часткі вядомых нам п'ес пакідае яшчэ жадаць шмат лепшага, выяўляе часам пэўную бездапамож насць аўтара ў кампазіцыі свайго твору, у выразнай экспазіцыі характараў, у належнай арганізацыі матэрыяла.

Некаторыя аўтары імкнуцца часам ахапіць у адным творы, як можна больш адказных праблем, амаль усе складанейшыя і сур'ёзнейшыя пытанні нашай рэчаіснасці разам, імкнуцца ахапіць рэчаіснасць ва ўсіх яе праяўленнях і дэталях, баяцца, каб не ўпусціць чаго з поля зроку. Адсюль запішняя раскіданасць, расплыўлівасть, неарганізаванасць, мазаічнасць кампазіцыі. Адсюль складанасць і грамоадкасць частак нашых драматычных твораў. Пазбаўлены фактычнай мар чымасці вырашыць як след усе пастаўленыя адразу перад глядачом праблемы, аўтар такога твору часта прымушан абмежавацца толькі пасхемай.

Драматургу трэба навучыцца канцэнтраваць свой матэрыял вакол пэўнага, рашаючага моманту, такім чынам, каб даць ўяўленне, даць разумение аб цэлым па адной толькі дэталі яго, па адной з частак гэтага цэлага, каб у гэтай дэталі адлюстраваць усё цэлае так, як у кроплі вады адлюстроўваецца сонца.

Трэба навучыцца паказваць нашу рэчаіснасць, ускрываючы яе ўлучыя тэндэнцыі не любым абмежаваным кавалку, у любым яе куту. Неабходна дабіцца таго, каб глядач, ці чытач зразумеў і ўспрыняў усе асаблівасці, усю веліч эпохі на адным якім-небудзь канкрэтным участку яе. Трэба пазбавіцца вялізарных і нязграбных, бясформенных драматургічных пабудоў, непрыстасаваных да сцэны расцягнутых і громоздкіх, якія па прыкладу сярэдневяковых містэрый імкнуцца ахапіць сваім зместам, гаворачы фігуральна, ледзь не ўсю гісторыю свету — ад Адама да нашых дзён. Трэба навучыцца ўцелясняць змест і ідэйную накіраванасць свайго твору ў выгадным рамкі драматургічнай архітэктонікі.

Тут прыходзіцца зноў адзначыць, што зусім дарэмна частка нашых драматургаў ігнаруе пытанні жанравай дыферэнцыяцыі сваіх твораў. Беларуская совецкая драматургія бедна яшчэ разнастайнасцю жанраў, але аб гэтым трэба нагадваць асобна. Кожнаму з драматургаў варта помніць словы Астроўскага аб тым, што «Самая цяжкая справа для пачынаючых драматургічных пісьменнікаў — гэта размяркоўваць п'есу, а няўмела зроблены сцэнарыум шкодзіць поспеху і губіць вартасць п'есы».

Старыя класікі драматургіі ўмелі гэта рабіць і шмат каму варта ў іх павучыцца.

«У перыяд рэканструкцыі тэхніка вырашае ўсё». Гэта цалкам прымяніма і да драматургіі. Ад гэтага нельга адмахнуцца. Адной толькі добрай воляй і жаданнямі аўтара, адной толькі палучанасцю ў яго добрых ідэй і намераў, без тэхнічнага ўмення ўцелясніць гэтыя ідэі ў моцную бліскучую, высока-мастацкую форму ва ўдала скампанаваную сістэму жывых, пераканальных, каларытных вобразаў, драматургічны твор ніколі не дасягне сваёй мэты. Праблема аўладання архітэктонікай драмы ва ўсю шырыню стаіць зараз перад нашым драматургам.

КАБ БЫЎ СЕКТАР УВЯЗКІ!..

Дырэктар трэста тав. Каралёў, спяшаючыся, зняў тэлефонную трубку і нецярпліва набраў патрэбны яму нумар.

Соўгасам трэста патрэбны карэмы. Гэтай справай у кіраўніцтве Упоўнаркамсоўгасаў займаецца сектар снабжэння, на чале якога стаіць тав. Плаўнік. І тав. Каралёў атрымаўшы трывожныя тэлеграмы ад раду соўгасаў, звоніць у сектар снабжэння. Куды-ж званіць, як не сюды?

Праходзіць мінута, дзве, тры ніхто да тэлефона не падыходзіць, ні хто не адказвае, хоць сігналы кажуць, што тэлефон не заняты.

Справу адкладваць нельга. Упарты Каралёў у другі і трэці раз набірае патрэбны нумар. Вынікі тыя-ж. Урэшце, разлаваны Каралёў звоніць у суседні сектар і просіць зайсці даведацца, у чым справа. Таварыш, увайшоўшы ў пакой, дзе вісіць тэлефон № 23931, знайшоў там затрымка сталамі трох функцыянераў: кіраўніка сектара паляводства Бабіцкага, сектара снабжэння — Плаўніка, сектара механізацыі — Окарэва. Гэта «святая тройца» з валіным натхненнем спрачаецца на тэму: ці можа наогул па справе хто да іх звоніць, і хто з іх у сувязі з гэтым павінен патурбаваць свой спакой і падыйсці к тэлефону.

Арганізацыйная структура Упоўнаркамсоўгасаў сапраўды дае права кіраўнікам бязлікіх сектароў над гэтым задумацца.

Як вядома, 75 проц. соўгасаў, абкіданых паркаматам, з'яўляюцца або свінагадоўчымі, або жывёлагадоўчымі. Здавалася-б, што калі не 75 проц., то прымамсі 50 проц. апарата камісарыята павінны былі зайняцца жывёлагадоўляй. Дарма: з усяго апарата толькі... тры чалавекі займаюцца гэтай справай.

Чым-жа займаюцца астатнія?

Астатнія людзі займаюцца пераважна планаваннем, улікам, статыстыкай, складаннем і запаўненнем форм, табліц, адным словам, усім тым, чым падабае займацца ўсякай «начоснай» установе, заблытаўшайся ў сценах свайго ўласнага бюракратызма.

Яблыка ад яблыні далёка не пакаціў — у Магілёўскім малочным трэсце з 49 работнікаў апарата ўсяго толькі тры чалавекі займаюцца жывёлагадоўляй. Тое самае ў астатніх трастах.

Былі калісці людзі, якія дыскусіравалі на пытанню, што для чаго: субота для чалавека ці чалавек для суботы? Работа Наркамсоўгасаў вельмі нагадвае нам такую пастаноўку пытання.

Есць у камісарыяце вытворчы сектар для апаратыўнага кіраўніцтва жывёлагадоўляй. На чале сектара стаіць тав. Шапавалаў. Есць у камісарыяце планавы сектар для планавання развіцця жывёлагадоўлі. На чале яго стаіць т. Мачочка. Есць і ўчотна-статыстычная група, якая падлічвае рэзультаты дзейнасці абодвух сектароў; на чале групы стаіць тав. Кудзінаў. І ўсе тры сектары адзін аб другім нічога не ведаюць, кожны самастойны, аўтаномны і адзін з другім гуляе ў кота і мышку.

Мачочка да Шапавалава: — А я табе не скажу, колькі запланіраваў аварасаў і апелаў на першы квартал. (А ў выніку, так званы «апаратыўны» сектар у канцы лютага змог не выдаць вытворчага плана першага квартала).

Шапавалаў да Кудзінава: — А я табе не скажу, хоць табе і трэба гэта ведаць. (А ў выніку, Упоўнаркамсоўгасаў яшчэ не мае зводак за студзень-люты аб ходзе ацёлаў).

Для каго планавы сектар плануе, адзін алах ведае. Вядома толькі адно: вытворча-апаратыўная група кіруе не па яго планах, а па-свойму — як уздумаецца. Шматлікія планы кіраўнік спраў т. Петроўскі акуратненька складваў ў шафу, хавае за сям'ю замкамі, каб, барані божа, як-небудзь пылінка на іх не села. А калі ўсё-ж бывае, што Шапавалаў спатрэбіцца план, ён падыходзіць да планавіка Ніспевіча, тры разы, нібы міласці просячы, пакланіцца, пакуль атрымае дазвол адным вокам заглянуць на мінуту ў план.

Так яно ў Наркамсоўгасаў і выходзіць — план для плана, учот для ўчоту; ну, а апаратыўнасць? Так, для фасона. Якая-ж там можа быць апаратыўнасць, калі 25 лютага, г. зн. на трэці тыдзень пасля пачатку масавых апаросаў, тав. Шапавалаў апэрыруе зводкамі на 1 лютага.

— Павінна-ж была ўсё-ж быць зводка на 10, на 20 лютага.

— Так, павінна была-б... Але што-ж рабіць, калі ўчотная група не дае. — пакрыўджана кажа тав. Шапавалаў. І тут-жа, паправіўшыся, ён ужо больш салідным басам дадае: — Наш сектар усё-ж ведае, як ў соўгасах ідуць апаросы, мы-ж жывую сувязь падтрымліваем з соўгасамі, тэлефон...

Пры праверцы гэта пацвердзілася: за адзін студзень намеснік упаўнаважанага Наркамсоўгасаў «з'еў» на тэлефонныя размовы ўвесь гадавы бюджэт, адпушчаны на гэту мэту. Па тэлефону кіруюць, па тэлефону апаратыўнасць праяўляюць, па тэлефону цялят гадуюць, свіней вырасліваюць... Так ужо да тэлефона прывыклі, што жывога чалавека сталі баяцца.

У лютым рад соўгасаў, асабліва свінагадоўчыя, адчувалі вострую патрэбу ў кармах. Прыехалі дырэктары соўгасаў і камісарыят да тав. Жолудава за вырашэннем гэтага пытання, а ён, як той страус, што схаваўшы галаву паміж уласных ног, думаў, што ніхто яго не бачыць, замкнуўся ў габінеце і адмовіўся прыняць іх. Прышлося гэтым дырэктарам хадзіць у ЦК партыі да тав. Пыжыкава, каб той хадайнічаў перад іх наркомам аб вырашэнні з імі хвалюючых і нездкладных пытанняў.

Перашкоды з кармамі планавік тав. Ніспевіч тлумачыць вось як: атрымаўшы з трэстаў весткі аб колькасці ўбранага сена і канцентраваных кармоў, планавікі выходзячы з наяўнасці кармоў, спусцілі ў соўгасы нарматывы кармлення. Вытворча-апаратыўны сектар, не лічачыся з нашымі нормамі, спусціў свае ўласныя нормы. А ў соўгасах гэтыя нормы так пераблыталіся, што наогул пачалі без усякіх норм расходаваць кармы, а ў выніку разбазарылі наяўныя фонды. Ну, вось і вышла яно так.

Наогул, тут у нас з дырэктывамі так справа пастаўлена, — кажа тав. Ніспевіч, — што часам сам за галаву бярэшся: як-бы яно чаго не вышла? Упаўнаважаны Наркамсоўгасаў займаецца апаратыўнымі справамі, яго намеснік — планавымі. Адзін плануе адно, другі робіць другое. Вось каб быў такі сектар, які-б увязаў планы аднаго з намерамі другога, тады-б можа і лягчэй працаваць было.

Ненакой тав. Ніспевіча мае пад сабой некаторыя даволі грунтоўныя надставы. Камісарыяту абавязкова трэба даць «сектар увязкі». А то, як бы яно сапраўды чаго не вышла, а час гарачы: ацёлы, апаросы пачаліся, хутка сеяць трэба пачаць.

Вось напрабуйце даведацца ў камісарыяце, як ідзе ў соўгасах падрыхтоўка да сяўбы. На вас глянуць такімі вачыма, што вы, спалохаўшыся, ці не сказалі якога-небудзь глупства, ад сораму вочы апусціце. Аказваецца, што пра такое «комплекснае» пытанне нельга даведацца толькі ў аднаго чалавека. Аб насенні трэба ў аднаго, аб гноі ў другога, аб каці ў трэцяга, аб механізацыі ў чацвертага, аб культурным абслугоўванні ў пятага, і т. д. Тут што ні пытанне, то асобны сектар, асобны чалавек. А як усё ж соўгасы падрыхтаваны да сяўбы — у камісарыяце ніхто толкам адказаць не можа.

Л. КАПЛАН.

ЭКСФОРШЫРДАУНЫ

(Ад спецыяльнага карэспандэнта „Звязды")

Слова гэта «эксфоршырдаўны» — цяжкае нямецкае слова: язык зламаеш, пакуль выгаварыш. Значыць яно: высокапародныя авечкі, завезеныя з Усходняй Прусіі. Есць такія і ў Лёзненскім раёне. Некалькі год таму назад НКЗВ выпісаў іх з Германіі. Дзяржава плаціла золатам, каждую, па 50 руб. за штуку. Слоў няма, важныя авечкі. Важаць каля 4-5 пудоў кожная, воўны даюць 4-5 кг. у год. Воўна мяккая, тонкая, шаўкавістая.

Які-ж лёс спаткаў гэтых чужаземак і чужаземцаў у Лёзненшчыне?

У той час, калі прывозілі на Беларусь эксфоршырдаўнаў, на чале НКЗВ быў Прышчэпаў — вядомы кулацкі апякун. Большасць эксфоршырдаўнаў тады была перадана «культурным», гэта значыць кулацкім гаспадаркам.

Партыя ўзначаліла масавы рух калектывізацыі. Партыя разграміла контр-рэвалюцыйную прышчэпаўшчыну; партыя разграміла кулацтва.

Эксфоршырдаўны сталі жывой мазмасцю калгасаў. Значная частка гэтых чыстакровак і метысаў ёсць і ў калгаснікаў.

Увосень 1933 года прыехаў у раён прадстаўнік НКЗВ шукаць эксфоршырдаўнаў. Пошукі не былі дарэмнымі: некалькі дзесяткаў кровак і паўкровак знайшлі. Парашылі: арганізаваць дзве племянныя аўцаводныя фермы. Справа добрая. Арганізавалі адну ў калгасе «Беларуская вёска», Веляшкоўскага сельсовета, другую ў калгасе «Чырвоная слабада», Высачанскага сельсовета.

***

На аўцаводнай ферме калгаса «Беларуская вёска» зараз 28 матак і адзін вытворнік. Больш паловы метысы, астатнія — кроўныя эксфоршырдаўны. Збіралі іх у калгасе «Бязбожнік», «Ударнік», Унаўскага сельсовета, «Страх ворагам» Выдрэскага сельсовета. Плацілі па 250 руб. За некаторых давалі па 2-3 простыя авечкі. Вытворнік — кроўны, калі прывезлі, важыў 4 пуды.

Як-жа ферма жыве цяпер, як гадуюцца авечкі, як родзяцца, растуць і развіваюцца ягняткі?

Чварць кілометра ад цэнтра калгаса, у былым кулацкім хляве стаяць эксфоршырдаўны. Хлеў вялікі, цёплы і асветлены. Але ўсе авечкі стаяць разам. Няма загародак, штуркатня. Ягняты ссуць чужых матак: хто дужай, той і сыцей — двух матак ссе. Па карытах ля ваданою копчуцца авечкі, брудзяць.

А чаму-б не прыладзіць у сцяне колікаў, каб на іх падымаць карыты?

Хворыя авечкі не адзелены. Чым яны хварэюць — ніхто не ведае. Ці глістамі, ці «мятлікамі», як тут называюць, або можа эхінакокам, як гаворыць ветэрынары. Ветэрынар і зоатэхнік ніколі не заглядваюць на ферму.

Тут на ферме высвятляецца і такі факт: сёлета нарадзілася трое ягнят нежывых, а не адно, як гаварыў нам старшыня калгаса т. Саладкоў. Усяго-ж ягнят 25, а не 17, як лічаць у праўленні. Так улічваюць залатое патомства кроўных эксфоршырдаўнаў. Вучотчыца тав. Галаднікава ці, як яе называюць, «чуць не загадчык фермы», не была тут ужо два тыдні.

Чаму нарадзіліся нежывыя ягняты? Здагадацца не цяжка: штуркатня ў агульным хляве, паенне халоднай вадой проста са студні (у хляве цёпла), хвароба на глісты і слабы корм не па рацыёну. І ўсё гэта — вынік дрэннай арганізацыі працы, абязлічкі.

Што яшчэ высветлілася ў авечніку?

Даглядчыцы Селязнёвай запісваецца 0,70 працадня за гурт авечак. Ніякай ацэнкі якасці працы. Расце маладняк ці не — працадні налічваюцца. Непрыкрытая ўраўнілаўка ў сістэма налічэння працадзён. Норм па догляду авечак няма ў калгасе, няма іх і ў раёне і наўрад ці ёсць яны ў Наркамземе...

Авечкам трэба даваць мурожнае сена. Ім даюць доўгае, грубае сена. І толькі. Ніякай падкормкі, хоць у праўленні калгаса і заяўляюць: «Фуражны фонд з адыходаў выдзелен для коняй і свіней, адсюль можна ўзяць і для авечак»... Можна, але не давалі. Маткі з ягняткамі худыя. Некаторыя такія худыя, што ледзь ходзяць, асабліва падсосныя маткі з блізнятамі. Іх трэба падкормліваць канцентратамі, дзёртым аўсом, радзь кай, але ніхто ў калгасе аб гэтым не думае.

Радаваўся наркамземавец т. Стойчанка, калі знайшоў частку эксфоршырдаўнаў і сабраў іх у кучу. Толькі што атрымалася? Знайшоў, убачыў і... забыў. Зноў забыты, закінуты гэтыя золата-авечкі.

***

Есць у Лёзненшчыне і другі гатунак вельмі каштоўных мясовых авечак, так званыя шлёнкі. Шлёнак шмат. Буйныя авечкі, з эластычнай воўнай, як і ў эксфоршырдаўнаў. На жаль, і яны забыты.

Вось аўцаводная ферма пры калгасе «Новы шлях», Унаўскага сельсовета. Гутарым з жывёлаводам калгаса тав. Сёмачкіным.

Авечак 27, вытворнікі — 2. Парода — у большасці шлёнкі. Вытворнікі кроўныя. Частка ёсць простых авечак. Перараджаюцца.

Чаму?

— А чорт іх ведае...

— Колькі-ж ягнят? — пытаемся далей.

Фота А. Мінуцкага.

Чыстакроўны ягнёнак ад «эксфоршырдаўнаў». (Калгас «Беларуская вёска, Лёзненскага раёна).

— Не ведаю. Прызнацца, даўно не была на ферме.

Ідзем з тав. Сёмачкіным на ферму. Старая даглядчыца тав. Лесукова паказвае авечак. Добрыя авечкі. Праўда, частка простых, або метысаў. Большасць жа—народзістыя шлёнкі.

— Чаму-ж са шлёнак выходзяць простыя авечкі? — пытаемся ў даглядчыцы.

І тут высвятляецца, што калгасныя народзістыя авечкі ходзяць разам з авечкамі калгаснікаў, а там простыя бараны — «казялкі». Вось і перараджаюцца.

Колькі ёй плоцяць, колькі ёй павінны налічыць працадзён — яна не ведае. Не ведае яна таксама, колькі ягнят нарадзілася, чым хварэюць яны.

З гэтых двух прыкладаў відаць, што пра авечку ніхто ў раёне не думае.

Эксфоршырдаўны, шлёнкі даюць магчымасць Лёзненшчыне ў бліжэйшыя год-два стварыць у калгасах і калгаснікаў велізарнае стада высокапрадукцыйных авечак.

Новае партыйнае і савецкае кіраўніцтва раёна павінна звярнуць сваю ўвагу на гэты забыты ўчастак. Эксфоршырдаўнам і шлёнкам — самы пільны догляд, лепшыя кармы зімой, пашу ўлетку. На аўцаводныя фермы — партыйнае вока, большэвіцкую арганізацыю працы і кантроль.

М. РУДНЯНСКІ.

ПА-БОЛЬШЭВІЦКУ УЗЯЦЦА ЗА ЗАКУПКІ ХЛЕБА

Тэмпы хлебазакупак па БССР за апошнія пяцідзеўкі рэзка знізіліся. Калі ў студзені і пачатку лютага пяцідзеўка давала ў сярэднім 500-550 тон, то ў другой палове лютага і ў сакавіку не больш 250-300 тон.

Да 10 сакавіка спажывецкая кааперацыя БССР закупіла толькі 11,3 проц. той колькасці, якую яна абавязалася загатовіць. Асабліва адстаюць рашаючыя хлебныя раёны: АРШАНСКІ даў толькі 12,5 проц., БЫХАЎСКІ 5,2, СЛУЦКІ 10,2, РАГАЧОЎСКІ 11 проц.

Мясцовыя кааператары апраўдваюць нізкія тэмпы закупак спасыланнямі на недахват тавараў стымулявання, на дрэнны асартымент. Зразумела, нельга сказаць, што завоз тавараў ідзе здавальняюча. Не мала выпадкаў, калі базы завозяць тавар дрэннага асартымента, прадукцыю, якую можна купіць у любым магазіне, калі базы па-казённаму адносяцца да сваіх абавязкаў. Аднак спроба ўзвяліць усю віну на базы яўна няўдалая.

Вопыт Менскага і Заслаўскага раёнаў, выканаўшых свае абавязацельствы па закупцы хлеба паказвае, што ўся справа — ва ўмелай арганізацыі работы. У рашаючым раёны завезена шмат тавараў: на сотні тысяч рублёў мануфактуры, мыла, жалеза, шкла. Трэба іх правільна размеркаваць паміж сельсо, не механічна, а з дакладным улікам ролі кожнай нізавой арганізацыі ў закупках.

Гутаркі аб адсутнасці тавараў вельмі часта з'яўляюцца заслонай для прыкрыцця бяздзейнасці і няўмення арганізаваць работу. Аб гэтым гаворыць рад фактаў.

Возьмем АРШАНСКІ раён. Толькі 17 студзеня, праз 5 дзён пасля апублікавання пастановы партыі і ўрада, райсаюз успомніў аб хлебазакупках і склікаў інструктыўную нараду старшынь сельпо. Да сярэдзіны лютага толькі 12 сельпо з 29 прыступілі да куплі хлеба. Больш таго. Райсаюз разбазарваў таварныя фонды стымулявання: 5 веласіпедаў было атрымана для ўсяго раёна, з іх 2 узяў былы старшыня праўлення ПЕСІН для прэміравання работнікаў райсаюза.

А БЫХАЎСКІ райсаюз? Старшыня райсаюза тав. РААК пачаў куплю з таго, што скарыстаў атрыманы на выкуп тавараў для стымулявання крэдыт на закупку вінных вырабаў. Толькі праз 6 дзён пасля пастановы партыі і ўрада былі разасланы па сельсоветах квітанцыйныя кніжкі. І зараз арганізацыйна-масавая работа ў калгасах не разгорнута, работнікі сельпо сядзяць у кранах і чакаюць: авось-хто небудзь прывязе хлеб. Ніхто не падумаў аб тым, каб арганізаваць развозкі, і даставіць тавары непасрэдна ў калгасы, каб правесці сярод калгаснікаў палітычна-масавую работу.

БЕШАНКОВІЦКІ раён даў толькі 1,6 проц. свайго плана. Бешанковіцкі райсаюз да апошняга часу нічога не зрабіў, каб падрыхтаваць сельпо да закупак. У радзе сельпо (Макар'еўскім і інш.) да сярэдзіны лютага не былі нават арганізаваны пункты по закупкам. Штат закупшчыкаў падабрен з чужых людзей, якія, судзіліся раней за розныя праступкі. Былы старшыня райсаюза тав. МОХАР, пры першай сустрэчы з прадстаўніком Белкаапсаюза Аверкіевым заявіў: «Хлеба ў раёне няма». Гэтыя апартуністычныя настроі з'явіліся сур'ёзным тормазам хлебазакупак. РК і РВК да апошняга часу нічога не зрабілі, каб нападзіць апаратыўнае кіраўніцтва кампаніяй.

Гэтыя прыклады паказваюць, што толькі апартуністычны самацёк, толькі адсутнасць увагі да куплі з боку раённых арганізацый з'яўляюцца асноўнай прычынай дрэннага ходу куплі.

Закупкі хлеба—важнейшая гаспадарча-палітычная кампанія. Ад правядзення гэтай работы залежыць разгортванне прадажы пачанага хлеба насельніцтву. Аб гэтым павінны помніць усе арганізацыі.

Абавязак усіх партыйных і савецкіх арганізацый—па-баявому ўзяцца за закупкі хлеба, нападзіць апаратыўнае кіраўніцтва гэтай работай, дапамагчы сельпо, шляхам пасылкі ў нізоўку лепшых актывістаў, правераных на справе людзей.

НЕ ІДУЦЬ ДАЛЕЙ БАЛБАТНІ

БАБРУЙСК (Ад кар. «Звязды») За месяц — з 10 лютага па 10 сакавіка спажывецкая кааперацыя Бабруйшчыны закупіла толькі 19 тон хлеба. Усяго з пачатку кампаніі закуплена 108 тон супроць 1.100 тон, якія кааперацыя абавязалася закупіць.

Ні адна пяцідзеўка не дае больш 4-5 тон зярна. А некаторыя сельпо на працягу 3-5 пяцідзевак не здолелі закупіць ні аднаго кілограма.

Райком КП(б)Б вынес спецыяльную пастанову аб закупках хлеба. Не дрэнная пастанова, але ўся бяда ў тым, што яна засталася на паперы і не ажыццяўляецца.

Напрыклад, не выканан пункт аб пасылцы адказных работнікаў у сельсоветы для арганізацыі куплі. За выключэннем сакратара РК тав. Мілера ніхто з горада не выехаў.

Нізавыя партыйныя і савецкія арганізацыі адносяцца да кампаніі па-бюракратычнаму. Многія сельсоветы і парторгі лічаць, што закупкі хлеба справа толькі сельпо.

У калгасе «Свет», Баравіцкага сельсовета на агульным сходзе калгаснікаў было пастаноўлена прадаць кааперацыі дзве тоны хлеба. Але старшыня сельсовета Аўсянікаў проста забараніў прадаваць такую колькасць прадукцыі.

— Будзеце без хлеба сядзець— запугваў ён калгаснікаў.

Аўсянікаў «міласціва» дазволіў прадаць кааперацыі толькі 0,5 тоны зярна.

Парторг Старцаўскага сельсовета Яновіч вядзе кулацкую агітацыю супроць прадажы хлеба кааперацыі.

Парторг Міхалёўскага сельсовета Каральковў «падлічыў», што выгадней прадаць хлеб на рынку, чым кааперацыі. Выходзячы з гэтага, ён парашыў, што яму, як парторгу, няма чаго рабіць, бо «усё роўна нічога не выйдзе».

Не дзіва, што старцаўскае сельпо за ўвесь час закупіла 10 проц. колькасці, адзначанай у яго ўласным абавязацельстве, а Міхалёўскае — і таго менш.

Зрыве куплю дрэнная работа кааперацыі. Кааператывы ўсё яшчэ не зразумелі, што хлеб сам не пойдзе, што работу трэба арганізаваць.

Там, дзе сельпо праяўляюць малейшую ініцыятыву — ёсць добрыя рэзультаты.

Паўлавіцкае сельпо пусціла па вёсках фургоны з таварамі. Крамнік заходзіць да калгасніка, аднаасобніка, прапануе яму патрэбны тавар, даказвае выгаднасць прадажы хлеба кааперацыі. Такія рэйсы даюць мінімум 5 цэнтн. зярна кожны дзень.

У Любоніцкім сельсавеце пазнякі фургонаў таксама давалі добрыя рэзультаты. Але там за ўвесь час зволелі арганізаваць толькі тры выезды і «стаміліся», як толькі спынілася выезды, спынілася і паступленне хлеба.

Наогул, балбатні вакол закупак многа, а справа не рушыцца з месца.

П. ЧЫКУН.

ЗАПАЛУ ХАПІЛА НЕ НАДОЎГА

ЕЛЬСК. (Спецкор «Звязды»). Спажывецкая сістэма Ельскага раёна абавязалася закупіць 100 тон хлеба. Да 15 сакавіка закуплена каля 18. Гэта рэзультат работы першых дзён. Раённыя арганізацыі супакоіліся на першых поспехах і поўнасцю дэмабілізаваліся. У райсаюзе горда заяўляюць: «У нас за купкі ідуць яшчэ добра, паглядзелі-б што робіцца ў іншых раёнах».

Праўда, хоць процант закупак хлеба ў раёне вышэй сярэднерэспубліканскага, аднак гэта не дае ніякіх падстаў для «галавакружэння аб поспехаў», бо хлебазакупкі па раёну праходзяць дрэнна.

Раённая партыйная арганізацыя не займаецца гэтым пытаннем. У Багучыцкім сельсавеце доўга знаходзіўся прадстаўнік райкома Медзведзеў, які займаўся чым хочаш, толькі не закупкамі. Ён катэгарычна адмовіўся ад правядзення гэтай работы. Па Багучынскім сельсавеце не закуплена ні аднаго кілограма.

Спажывецкая кааперацыя не выконвае дырэктыву ўрада аб завозе тавараў для стымулявання закупак. У крамах нельга знайсці такія тавары як ваконнае шкло, цвікі, вяроўкі, на якія прадаўцы хлеба прадаўляюць вялікі попыт.

Для хлебазакупачнага фонда адпушчаны тавары, якія прадаюцца ва ўсіх крамах. Характэрная дэталь: ельскія кааператары абяцаюць, праз некалькі тыдняў — г. зн. к вясне — завезці валёнкі. Гэта абяцанне ярка ілюструе іх мэтады гандлёвай работы. Д—ні.

БССР адстае ў спаборніцтве па дорбудаўніцтву

Ва ўмовах быстрага ўздыму народнай гаспадаркі, росту тэхнічнай узброенасці сельскай гаспадаркі і значнага пашырэння тавараабароту дарожнае будаўніцтва набывае выключна важнае гаспадарча-палітычнае значэнне. Недарма ў спаборніцтве з Чувашскай АССР уключаюцца ўсё новыя і новыя рэспублікі і вобласці, пераўтараваны спаборніцтва ва ўсесаюзны паход за культурную совецкую дарогу.

Больш трох месяцаў як заключан соцдагавор паміж БССР і Чувашскай рэспублікай. Якія рэзультаты?

Чувашыя ўзяла на сябе абавязацельства да 17 з'езда загатовіць і вывезці на трасу 56 проц. будматэрыяла. Як вядома, яна гэта абавязацельства з гонарам выканала: камення загатовіла на 143 проц., а вывезла на трасу 112 проц., пяску вывезла 78 проц., лесу загатовіла 101 проц., вывезла — 70 проц.

Непараўнальна горшай становішча ў нас, у БССР. Камення загатоўлена ўсяго 36,9 проц., а вывезена на трасу і таго менш — 9,6 проц. Лесу загатоўлена 28,4 проц., вывезена — 16 проц. Гравія-ж вывезена толькі 8 проц.

СНК БССР 28 студзеня ў сваёй пастанове аб дарожным будаўніцтве з ўсёй рашучасцю папярэдзіў Галоўдартранс і РВК аб адказнасці за ход падрыхтоўкі да дарожных работ. Адстаўнае БССР, як зусім правільна ўказана ў пастанове, ёсць рэзультат слабай масава-палітычнай і арганізацыйнай работы ў калгасах, і сярод працоўных аднаасобнікаў.

Галоўдартранс і яго органы на мясцах яшчэ не перабудаваліся. Асабліва дрэнна арганізавалі работу аддзел эксплаатацыі і кантора механізацыі Галоўдартранса. З іх боку няма апаратыўнага кіраўніцтва мясцамі. Выключна дрэнна пастаўлена работа ў віцебскіх і гомельскіх майстэрнях, у учдоры 702, 703 і 707.

Рад раённых арганізацый да справы дарожнага будаўніцтва адносяцца па-бюракратычнаму. Гэта ў першую чаргу датычыць Асіпавіцкага, Заслаўскага, Лагойскага Пухавіцкага, Плешчаніцкага, і інш. раёнаў. Тут абмежаваліся фармальным выкананнем справы — вынеслі пастановы і на гэтым палічылі свае функцыі скончанымі Практычна-ж нічога не зроблена, каб забяспечыць пярэшынства з Чувашыяй.

Наглядаюцца выпадкі проста па гардлівых адносін з боку некаторых раённых арганізацый да справы дарожнага будаўніцтва. Вось, у Плешчаніцах старшыня РВК Кофман упарта адмаўляўся ставіць пытанне аб спаборніцтве з Чувашыяй на прэзідыуме РВК. Патра бавалася шмат намаганняў дарожных арганізацый, каб пераламаць ні чым неапраўдальную ўпартасць.

Трэба сказаць, што комсамол і Аўтадор вельмі слаба ўключаюцца ў спаборніцтва за пярэшынства БССР. Абвешчаны ЦК ЛКСМБ паход за культурную дарогу ў радзе раёнаў (Пухавіцкім, Заслаўскім, Віцебскім, Талачынскім і інш) не пахопілен. Аўтадор слаба раскочваецца. Маўчыць і раённы друк.

Вядома, што поспех Чувашскай АССР тлумачыцца іменна тым, што ў барацьбе з бездарожжам прымалі ўдзел усе арганізацыі, што пры іх арганізуючай ролі былі ўзняты шырокія масы калгаснікаў і працоўных аднаасобнікаў. У нас гэтага яшчэ няма, а трэба дабіцца ва што-б там ні стала.

Канкрэтнае апаратыўнае кіраўніцтва, шырокая масавая работа— асноўныя ўмовы, якія забяспечаць пярэшынства БССР у спаборніцтве па дарожнаму будаўніцтву.

ГРОЗНЕР

АНЦІПЕНКА, СТЫРНЕ

Улічыць урокі ільнапеньказагатовак

Толькі 16 раёнаў БССР выканалі план ільназагатовак і 7 раёнаў — план пеньказагатовак. Гэта значыць, што дырэктывы Бюро ЦК КП(б)Б на пытанню ільнапеньказагатовак да пытання часу не ажыццёўлены большасцю раёнаў, гэта значыць, што барацьба за лён многімі раённымі вярхамі ільназагатовачнымі, замельнымі і совецкімі органамі праводзіцца зусім нездавальняюча.

Другі пленум ЦК КП(б)Б абавязаў усе гаркомы і райкомы КП(б)Б усяверна ўзмацніць работу, каб у бліжэйшыя дні поўнасцю выканаць план загатовак ільну і пянькі. Трэба канчаткова з апартуністычнымі, куда кулацкімі разважаннямі і спасыланнямі на адсутнасць ільну. Лён і пянька ёсць, іх трэба толькі загатовіць. Необходна ўмела спалучыць палітычна-масавую работу з адміністрацыйным уздзеяннем на тыя гаспадаркі, якія злосна сабатуюць здачу ільну і пянькі. Трэба прыняць меры для весняга рассцілу ільнатрасты і замочкі пеньказаломы, затрашчыхся з восені мінулага года. Уся гэта прадукцыя абавязкова павінна быць апрацавана і здана ў ніж плана загатовак.

Такое рашэнне апошняга пленума ЦК КП(б)Б і гэтае рашэнне павінна быць абавязкова выканана. Поспех гэтага выканання вырашае наша работа. Патрэбна помніць указанне тав. Сталіна на XVII з'ездзе ВКП(б) аб тым, што ва ўмовах планавай гаспадаркі «адказнасць за нашы пра рывы і недахопы ў рабоце кладзецца з гэтага моманту на дзевяць дзесятых не на «аб'ектыўныя» ўмовы, а на нас саміх і толькі на нас самых». Абсалютная правільнасць гэтага большэвіцкага выказу нашага мудрага вяліка тав. Сталіна асабліва ярка пацвярджаецца дрэннай работай партарганізацый адстаючых раёнаў БССР.

— Мсціслаўскі раён вясной адрапортаваў, што ім засеяна 10.784 га ільну. Восенню ў зводках гэтага-ж раёна фігуравала, што лён убран на 6 малоч. і разослан і паднят. Раённы план загатовак льна выканан на 69 проц.

Праведзеная 2 лютым праверка гэта «будзем садзіць»... На гэтым уся прамова прыехаўшага была скончана. 12-ці старшыням калгасаў — удзельнікам нарады—было прапанавана:

«Заўтра, далажыць мне аб выкананні даных мною дырэктыў». Але заўтра-ж раніцой Лахман, не праверыўшы сваіх «дырэктыў», выехаў у Касцюковічы і нямала, напэўна, хваліўся, як ён «заварчваў» у Пячорскім сельсавеце.

Зразумела, што такое кіраўніцтва не арганізуе, а дэзарганізуе ўсю работу. Зразумела, што такімі метадамі работы ні лесавыязкі, ні ільназагатоўкі не выканаеш.

Кіраўніцтва Белзаготільну нямала напісала цыркуляраў, загадаў, рэзалюцый пра ільназагатоўкі, нямала праводзіла пасяджэнняў, нарад, дакладаў. Затое зусім мала, надзвычай мала работнікі Белзаготільну займаліся канкрэтнай, практычнай работай непасрэдна ў раёнах.

Па Касцюковіцкаму раёну, напрыклад, у Смольканскім, Негенскім, Беседавіцкім сельсоветах, з удзелам тэхнічнага апарата раённай канторы Заготільну, на вясковых сходах для заключэння кантрактацыйных дагавораў па ільну выбіралі ўпаўнаважанага, запаўнялі з ім бланкі кантрактацыйнага дагавору і на гэтым справа лічылася закончанай. Кантрактацыйныя абавязацельствы па пасеву ільну, догляду за ім, па здачы валакна,—з калгаснікамі і працоўнымі аднаасобнікамі, нават, не абгаварваліся. Кантрактацыйныя бланкі аставаліся не падпісанымі, а Заготлён называў гэта «кантрактацыйнымі дагаварамі».

XV з'езд КП(б)Б у сваіх рашэннях запісаў:

«Развіццё ільнаводства ў БССР прадстаўляе сабой адну з галоўнейшых задач сельскагаспадарчай вытворчасці».

Разам з гэтым у тых-жа рашэннях сказана, што «ільнаводства ў БССР пры некаторых поспехах усё-ж не стала дагэтуль прадметам клопатаў усіх нашых арганізацый. Адсюль ніская ўраджайнасць, дрэнная якасць, дрэнны ход з года ў год выканання планаў ільназагатовак».

Гэта ацэнка нездавальняючай работы на ільну і канаплях абавязвае ўсе партарганізацыі, усе совецкія і замельныя органы **«рашуча палепшыць работы па развіццю ільнаводства, стварэючы тым самым базу тэх нічнай вырашэнні для далейшага будаўніцтва магутнай ільнаперапрацоўчай прамысловасці СССР і БССР».**

Рашэнні з'езда абавязваюць нас пакончыць з практыкай «клопатаў» аб ільну тады, калі ўжо зрываюцца ільназагатоўкі. Ільном і канаплямі трэба займацца з дня ў дзень, пачы наючы ад падгатоўкі да сяўбы, пра вядзення яе, праполкі, уборкі, расцілу, пад'ёму трасты, канчаючы пераапрацоўкай і здачай ільнянага валакна дзяржаве.

Ільнаканаплявоцтва павінна стаць прадметам клопатаў усіх арганізацый. Задача наша—арганізаваць работу па ільну і канаплях так, каб пад гэтыя культуры даваць лепшыя землі, засяваць іх лепшым пасеннем, прыглядаць і ахоўваць іх ад сямян цёвых траў, своечасова ўбіраць і добраякасна апрацоўваць лён і канаплі.

Пастанова ЦК ВКП(б) і СНК СССР аб мерапрыемствах па развіццю канаплявочай гаспадаркі адыгрывае вялікую ролю для БССР. Няма сумнення, што калгаснікі і працоўныя аднаасобнікі адкажуць на гэту пастанову яшчэ большым узядам творчага энтузіязма, павелічэннем клопатаў аб гэтай важнейшай культуры—канаплях, даб'ёцца павышэння іх ураджайнасці.

Зараз асаблівай увагі патрабуе кантрактацыя ільну і канапель. Задача ўсіх партарганізацый, совецкіх і замельных органаў—арганізаваць кампанію заключэння кантрактацыйных дагавораў па ільну і канаплях, так, каб давесці пастанову партыі і ўраду пра ільготы пасеўшчыкам канаплі да кожнага калгасніка і працоўнага аднаасобніка, каб у кожным калгасе, вёсцы, сельсавеце гэта выключная важнасці работа была ўвязана з урокамі ільнапеньказагатовак. Улічыць урокі пеньказагатовак мінулых год—гэта значыць займацца ільном і канаплямі так, як займаюцца хлебам зернавыя раёны СССР.

Улічыць леташнія ўрокі ільнапеньказагатовак—гэта значыць ужо зараз пастаўіць перад кожным калгасам і аднаасобнай гаспадаркай службу ільну і пянькі і догляд за гэтымі культурамі, як важнейшую гаспадарча-палітычную задачу, паспяховае вырашэнне якой кожным калгасам мае найвялікшае значэнне ў барацьбе за ажыццяўленне лозунга тав. Сталіна —зрабіць калгасы большэвіцкімі, а калгаснікаў—заможнымі.

РВК У РОЛІ НАГЛЯДАЛЬНІКАЎ

Терэхоўка

Загатоўка лесаматэрыялаў для дорбудаўніцтва ў Терэхоўскім раёне фактычна правалена. Работнікі Крупскага, Грабаўскага, Гардуноўскага і Агародня - Гомельскага сельсоветаў катэгарычна адмаўляюцца даць рабочую сілу і коняй на лесавыязкі, матывуючы тым, што «мы і так перагружаны работай».

Райаддзел некалькі раз даводзіў аб гэтым да ведама прэзідыума РВК, але ён ніякіх рэальных захадаў не прымаў.

Ні на адной з праведзеных райвыканкомам нарад старшынь сельсветаў пытанне аб дорбудаўніцтве не станілася.

Н—к.

Клімавічы

Клімавіцкі райвыканком зусім не цікавіцца справай дарожнага будаўніцтва. Ніякай масавай работы па папулярызацыі соцдагавора з Чувашскай АССР не праводзіцца. Вось чаму работы па падрыхтоўцы да дарожнага буд

ЦЫРКУЛЯРЫ ГЕРЫНГА АБ ТАЙНАЙ ПАЛІЦЫІ

БЕРЛІН, 12. (БЕЛТА).

Прускі прэм'ер Герынг у якасці кіраўніка прускай тайнай паліцыі выдаў два распараджэнні аб дзейнасці тайнай паліцыі.

Першым распараджэннем усім падначаленым паліцэйскім інстанцыям прадпісана прадставіць яму да 20-га сакавіка спіскі арыштаваных не па суду, а ў адміністратыўным парадку, з прапановамі аб далейшым лёсе арыштаваных. Другім распараджэннем з 31-га сакавіка адмяняецца права адпаведных органаў рабіць так званыя ахоўныя арышты («Шуцгафт») на аснове распараджэнняў дзяржаўнай тайнай паліцыі, вышэйшых правінцыяльных улад, паліцэй-прэзідэнта Берліна і органаў дзяржаўнай паліцыі ў падначаленых ім раёнах.

Органы нацыянал-соцыялістскай партыі і нацыянал-соцыялістскай арганізацыі пазбаўляюцца права арыштоўваць. Аб арыштах, праведзімых паліцэйскімі ўладамі, павін на быць на працягу 24-х гадзін паведамлена прускаму прэм'еру.

Другое распараджэнне Герынга змяшчае рад агаворак, якія істотна абмяжоўваюць яго значэнне. Абодвума распараджэннямі маецца на ўвазе ў большай меры цэнтралізаваць рашэнні пытання аб арыштах у руках агульнагерманскага ўрада, і аслабіць нездавалене не грамадскай думкі мноствам арыштаў, праведзімых без прад'яўлення абвінавачання.

ВАЕННЫЯ СІЛЫ ГЕРМАНСКАГА ФАШЫЗМА

ПАРЫЖ, 12. (БЕЛТА).

Паводле слоў «Матэн», германскія нацыянал-соцыялістскія штурмавыя атрады падзелены на часці, якім прысвоены нумары палкоў б. імператарскай арміі. Пасля аб'яўлення вайны ваенныя сілы германскай манархіі налічвалі, паводле слоў газеты, 225 пяхотных палкоў, але ўжо некалькі тыдняў назад на парадзе нацыянал-соцыялістскіх штурмавікоў у Лейпцыгу прайшла часць з нумарам 245.

ПРАВАЛ ТУРЭМНАГА ЗАКОНА Ў ШВЕЙЦАРЫІ

ВЕНА, 12. (БЕЛТА).

Як паведамляюць з Швейцарыі, пастаўлены ўрадам на народнае галасаванне законапраект аб «ахо не дзяржавы» адхілен 486 тыс. га ласоў супроць 416 тыс.

Урад матываваў законапраект неабходнасцю прымаць больш суровыя меры «як супроць нацыянал-соцыялістскай агітацыі, так і супроць дзейнасці кампартыі». Аднак, астрыё законапраекта было фактычна накіравана супроць рабочага класа.

Швейцарская кампартыя і Камітэт адзінага фронта вялі энергічную барацьбу супроць законапраекта, мабілізуючы масы пролетарыята пад лозунгам адзінага фронта, супроць турэмнага закона.

Не гледзячы на шалёнае цкаванне не комуністаў соцыял-дэмакратычнымі лідэрамі, супроць законапраекта, апрача комуністаў, галасавалі таксама соцыял-дэмакратычныя рабочыя.

ПРАЦЭС СУПРОЦЬ 20 ЧЛЕНАЎ ЦК АУСТРЫЙСКІХ С.-Д.

ВЕНА, 12. (БЕЛТА).

Супроць 20 членаў ЦК соцыял-дэмакратычнай партыі ўзбуджана справа па абвінавачанню ў здрадзе. 5 з іх: Бауэр, Дэйч, кіраўнік рэфармісцкага профсаюза чыгуначнікаў Кеніг, сакратар рэфармісцкага профсовета Шорж і кіраўнік шуцбунда Гейнц уцяклі за граніцу, астатнія ў турме.

Абвінавачанне ў здрадзе прад'яўлена таксама раду кіраўнікоў соцыял-дэмакратычных, гаспадарча-фінансавых прадпрыемстваў і некалькім кіраўнікам шуцбунда.

РАСПРАЦОЎКА НОВАЙ КІТАЙСКАЙ КАНСТЫТУЦЫІ

ШАНХАЙ, 12. (БЕЛТА).

Законадаўчая палата прыступіла да распрацоўкі новай канстытуцыі Кітая. Праектуецца прадаставіць насельніцтву грамадзянскія правы. Аднак, гэтыя правы могуць быць скасаваны, калі гэтага патрэбуе «грамадскі парадак».

ЗНІШЧАЛЬНІКІ ЖЫВЁЛЫ НА ЛАВЕ ПАДСУДНЫХ

КАСЦЮКОВІЧЫ. (Па тэлефону ад наш. спецыяльнага карэспандэнта).

У мястэчку шмат калгасных фурманак, дарма, што будзённы дзень. Паведамленне пракуратуры аб прыцягненні да судовай адказнасці кіраўнікоў зямельнага аддзела і раду калгасаў за масавае знішчэнне жывёлы ў КАСЦЮКОВІЦКІМ раёне выклікала поўнае ўхваленне з боку шырокіх мас калгаснікаў і працоўных аднаасобнікаў. Нумары газет «Соц. земледелие» і «Звязда», выкрываючыя кулацкую дзейнасць на кароўніках і свінарніках Касцюкоўшчыны, чыталіся ў самых далёкіх кутках раёна. Шмат выпадкаў, калі за дзесяткі кілометраў прыязджалі сяляне на пошту знайсці газету, прачытаць аб тым, як страціўшыя класавую пільнасць кіраўнікі зямельнага аддзела спрыялі таму, што кулацкі нож беспакарана гуляў па коровах, цялятах і свінях.

Учора, 12 сакавіка аб гэтым падробна расказаў нам. старшыні вярхоўнага суда БССР тав. Абрамаў, які пры напружанай цішыні перапоўненага нардома зачытваў абвіна вачвае заключэнне. У зале, поўнай да адказу, людзі стаяць, сядзяць, увесь час прыходзяць новыя. Стаяць і слухаюць.

...Абвінавачваюцца загадчык райземаддзела ПАЎЛЮЧЭНКА, нам. старшыні раённага аб'яднання жывёлагадоўлі БУГРЫ, раённы зоатэхнік ТАРАПАЎ, старшыні калгасаў, загадчыкі МТФ і СТФ: ВЕРАМЕЕЎ, ПІСМАН, БЫЧКОЎ, НАВУМЕНКА, ДЗЕРАХ — у тым, што, за другую палову 1933 г. у раёне знішчана 8.400 галоў рагатай жывёлы, 7.800 авечак, 7.000 свіней. У раёне 82 проц. ялавых конематак.

Пры гэтых умовах Паўлючэнка пашоў на просты шлях ашуканства партыі і ўрада. Замест мабілізацыі ўвагі ўсяго раёна на падрыхтоўку жывёлы да зімы, Паўлючэнка выступаў на райпартканферэнцыі з дакладам, што соцыялістычная жывёлагадоўля расце, павялічваецца, адным словам, што ў раёне ўсё добра. А ў выніку: кароўнікі, цялятнікі, свінарнікі не былі падрыхтаваны, а калі пачаліся масавыя ацёлы і апаросы, парасяты і цяляты пачалі дохнуць. За першыя два месяцы 1934 года загінула 10 проц. сёлетніх апаросаў і 11 проц. сёлетніх ацёлаў. У цэлым радзе калгасаў выразаны ўсе цяляты.

Паўлючэнка, Бугры, Тарапаў занялися не толькі «очковтирательством». Яны сталі на шлях абкрадвання дзяржавы, даючы скідкі на 30 проц. па мапаказдачы для 15 калгасаў, у якіх лічыліся міфічныя малочныя фермы, літаральна без адной каровы.

Крок за крокам выкрывае абвіна вачвае заключэнне антыдзяржаўную дзейнасць, сабатаж кіраўніцтва жывёлагадоўлай у Касцюковіцкім раёне. Гэта прывяло жывёлагадоўлю раёна да поўнага заняпаду, а кіраўнікоў зямельнага аддзела на лаву падсудных за крымінальнае злачынства, прадугледжанае 196 арт. крымінальнага кадэкса.

Дзяржаўнае абвінавачанне падтрымлівае памочнік пракурора рэспублікі тав. ШЫФРЫН. Грамадскі абвінаваўца — прадстаўнік газеты «Соц. земледелие» тав. ШУЛЬНІН.

12 сакавіка вечарам суд пачаў да пытваць загадчыка райземаддзела Паўлючэнка.

Паўлючэнка вінаватым сябе не прызнае. У крайнім выпадку, ён можа згадзіцца, што з яго боку было «очковтирательство», але-ж гэта не злачынства...

Дзве гадзіны суд высвятляў становішча кіраўніцтва жывёлагадоўлай. Выяўляецца, што аб масавым знішчэнні пагалоўя, аб шкодніцкім планаванні, аб непадрыхтаванасці да зімы Паўлючэнка ведаў, але будучы заняты другімі, як ён лічыў, больш важнымі справамі, ён нічога ў гэтым напрамку не зрабіў.

— Як-жа можна такое злачынства кваліфікаваць папітычна? — пытаецца ў падсуднага старшыня суда.

Усялян ухіляючыся ад прамога адказу, падсудны, нарэшце, прызнаецца:

— Гэта па сутнасці — кулацкая справа: вінават той, хто гэта рабіў і той, хто замоўчваў...

План уборкі сенажаці па раёну сарван. Тысячы гектараў асталіся не скошанымі. Засіпасавана толькі 70 проц. плана. Яшчэ на сёнешні дзень не размеркавалі кармы на працадні.

На пытанне, хто-ж вінават у гэтым злачынным ігнараванні кармавой базы, падсудны пералічвае загадчыкаў ферм, старшынь калгасаў і сельсоветаў, але ні ў якім разе ні ён, ні апарат райземаддзела, які ў першую чаргу нясе адказнасць за гэту справу.

У працэсе судовага следства высвятляецца характэрная дэталь. Ігнараванне жывёлагадоўлі выраслa ў раёне ў цэлую сістэму. Калі хтонебудзь прабаваў звярнуць увагу кіруючых арганізацый на масавае знішчэнне пагалоўя, загадчык аддзела райкома тав. ЛАХМАН адказваў:

За лён будуць біць, а за жывёлагадоўлю біць не будуць. У выпадку чаго — ківайце на райком.

Так кіраўнікі райземаддзела ўтойвалі сапраўднае становішча рэчаў і стараліся ўвесь час пасыпаць хлуслі выя весткі ў Менск, а таксама і ў раённыя арганізацыі, для таго, каб прыкрыць сваю злачынную бяздзейнасць.

— Як-жа вы, як член партыі, як адказны совецкі работнік, усё-ж змаглася з гэтым злачынным становішчам,—пытаецца ў падсуднага старшыня суда.

Паўлючэнка пачынае даказваць, што ён зрабіў максімум магчымага. Ён ставіў пытанне, мабілізоўваў усе сілы, чытаў даклады, пасылаў людзей у сельсоветы, узгадняў гэта пытанне з райкомам, райвыканкомам... Адным словам, падсудны аперуе ўсім арсеналам штампованых пустых фраз, якіх заўсёды поўны ворах у любога балбатуна.

— А якія вынікі вашай балбатні? —пытаецца пракурор т. Шыфрын.

— Вынікі, вынікі... Але я не вінават, другія вінаваты. І давай зноў шукаць вінаватых кампаньёнаў.

У пачатку допыту ён прабаваў тлумачыць увесь судовы працэс непаразуменнем, але пад ударам фактаў, прыведзеных пракуратурай і прадстаўніком грамадскага абвінавачання, Паўлючэнка пачынае адступаць, хавацца за спіну ўсялякіх аб'ектыўных прычын і ў выніку прызнаецца, што за такія саноўна-панскія метады кіраўніцтва жывёлагадоўляй вінаватыя павінны панесці адказнасць перад пролетарскім судом. Але зноў - такі, не ён.

— А за масавы забой цялят у апошнія месяцы вы адказваеце?— пытаецца пракурор.

— Так, не паспеў я яшчэ заняцца гэтым пытаннем.

— А за поўную адсутнасць кіраўніцтва жывёлагадоўляй аграмаджанага сектара і індывідуальнага кары стання вы адказваеце?

— Гэта пытанне ў нас было прадугледжана ў каляндарным плане,— адказвае падсудны пад громкі рогат усіх прысутных.

Чынушы з зямельнага аддзела адкладвалі гэту справу на больш спакойны час, каб класавы вораг скары стаў гэта для знішчэння пагалоўя.

— А колькі знішчана галоў у аграмаджаным сектары, вы ведаеце, — пытаецца грамадскі абвінаваўца.

— Такіх вестак у нас з Менска не патрабавалі, так што я іх не ведаю, —адказвае падсудны, — такіх форм для зводак у нас не было.

— Так, па форме правільна, а па сутнасці здзек,—рэзюмірує судовае следства старшыня суда. Гэта-ж факт, што да сігналу суда, вы нагоп жывёлагадоўляй не займаліся?

— Так,—вымушан прызнаць падсудны.

Першае пасяджэнне 12 сакавіка закончылася допытам падсуднага Бугры. Увесь дзень 13 сакавіка суд займаўся допытам астатніх шасці падсудных, і пачаў допыт сведак.

ПРАВЕРКА СТАНОВІШЧА ТАВАРАЗВАРОТУ

Для азнаямлення са становішчам таваразвароту ў БССР прыбыў намеснік старшыні Камітэта таварных фондаў пры СПА т. КВІРЫНГ.

У Менску т. Квірынг наведаў базы Белкаапсаюза, Белгандлю, швэйзбыту і іншых арганізацый, дзе падрабязна знаёміўся з пастаноўкай іх работы.

Тав. Квірынг выязджаў таксама для азнаямлення з работай каапераціы ў Барысаўскі, Смалявіцкі і Чэрвеньскі раёны.

Пасля т. Квірынг правёў рад спецыяльных нарад, прысвечаных пытанням таваразвароту з работнікамі ЗРК і орсаў г. Менска, а таксама работнікаў саматужна-прамысловай каапераціы сумесна з работнікамі арцеляй. І, нарэшце, т. Квірынгам праведзена сумесна з банкам спецыяльная нарада аб фінансавым становішчы Белкаапсаюза і Белгандлю.

Сёння тав. Квірынг зробіць даклад на пасяджэнні СНК аб становішчы таваразвароту ў БССР.

ГАСТРОЛІ МАСКОЎСКІХ ТЭАТРАЎ

З ліпеня ў Менску пачнуцца ГАСТРОЛІ МАСКОЎСКАГА ТЭАТРА РЭВОЛЮЦЫІ. Тэатр прабудзе ў Менску каля месяца. За гэты час ён пакажа п'есы «Мой друг», «Улица радости», «Человек с портфелем», «Хорошая жизнь». Затым тэатр выедзе на гастролі ў Гомель і Віцебск.

У чэрвені ў памяшканні Беларускага Яўрэйскага дзяржаўнага тэатра пачнуцца гастролі ДЗЯРЖАЎНАГА ЯЎРЭЙСКАГА ТЭАТРА РСФСР, які пакажа «Колдуны», «200 тысяч», «Путешествие Бенжамина III», «Три изюминки» і інш.

Чакаецца таксама прыезд маскоўскага тэатра юнага гледача.

НОВЫЯ ПАСТАНОЎКІ ЯДТ

Яўрэйскі дзяржаўны тэатр працуе над п'есай А. Кушнерова «БРАТЫ ГАРМАТ». У партфелі тэатра— п'еса яўрэйскага пісьменніка Л. Зіскінда — аб рэвалюцыйнай барацьбе працоўнага сялянства на Заходняй Украіне і новая п'еса Біль—Белацэркоўскага «Жыццё кліча».

У студыі тэатра таксама ідзе работа над п'есай В. Кіна «Наша маладасць».

КІНО

У МЕНСКУ БУДЗЕ ПАБУДОВАН НОВЫ ГУКАВЫ КІНО-ТЭАТР НА 1500 МЕСЦ

СНК БССР вызначыў рад мерапрыемстваў па паляпшэнню работы кінотэатраў.

Будаўніцтва кінотэатра «Пролетарый» у Менску павінна быць скончана не пазней 1-га мая 1934 г., а кінотэатра ў Оршы не пазней 11-га ліпеня.

У 1934-35 г. у Менску будзе пабудован новы гукавы кінотэатр на 1.500 месц.

У кінотэатрах Полацка, Оршы, Барысава, Магілева і Бабруйска арганізуюцца сістаматычныя дзіцячыя кіносеансы. Такія-ж дзіцячыя кіносеансы будуць наладжаны ў Мазыры, Слуцку, Дрысе і Лепелі.

Менскі дзіцячы кіно-тэатр значна папышраны, будуюцца спецыяльныя пакоі пры тэатры для выхаваўчай работы сярод дзяцей.

АЛІМПІЯДА ДЗІЦЯЧАЙ МАСТАЦКАЙ САМАДЗЕЙНАСЦІ

У чэрвені гэтага года адбудзецца ўсебеларуская алімпіяда дзіцячай мастацкай самадзейнасці.

Для кіраўніцтва алімпіядай створана камісія ў складзе т. т. КОНІКА (старшыня), ЧАРНУШЭВІЧА, ГЕРЦОВІЧА, КАВАЛЬЧУКА і ПЫЖЫКАВА.

Для прамірання лепшых юных майстроў выдзелен фонд у 20.000 р.

НОВЫ СТАРШЫНЯ МЕНГАРСОВЕТА

Тав. ЖУКОВІЧ, былы нарком комунальнай гаспадаркі БССР, уведзен у склад прэзідыума і пленума горсовета і выбран яго старшынёй.

НАЗНАЧЭННІ

Тав. СААК'ЯН А. М. зацверджан першым намеснікам старшыні СНК і намеснікам старшыні Эканомсовета з аслабаненнем яго ад абавязкаў упаўнаважанага Камітэта заготовак СНК СССР па БССР.

Другім намеснікам старшыні СНК і намеснікам старшыні Эканомсовета зацверджан тав. ГАЛЕНДА М. С. з выкананнем абавязкаў старшыні Дзяржплана пры СНК СССР.

* * *

Тав. САКАЛЕНКА А. А. назначан СНК упаўнаважаным народнага камісарыята цяжкай прамысловасці СССР пры СНК БССР.

Назначэнні перададзены на зацверджанне ў прэзідыум ЦВК.

УНІВЕРМАГ КУЛЬТУРНЫХ ТАВАРАЎ

У Менску арганізуецца першы паказальны ўнівермаг культурных тавараў. Для гэтай мэты адводзіцца ніжні паверх дома Белкаапсаюза. Універмаг будзе мець аддзелы—наглядных дапаможнікаў, палітэхнічнага абсталявання для школ, цацак, фота-аддзел з лабараторыяй, музычных інструментаў і радыё. Універмаг будзе абслугоўваць палітэхнічныя майстэрні школ, фізічныя кабінеты, хімічныя лабараторыі, аграгурткі калгасаў і саўгасаў і г. д.

Універмаг адкрыецца ў канцы красавіка.

НОВЫЯ КНІГІ

Юнацкі сектар ДаВВ выпусціў у свет «Ля сцен Карфагена» Г. Флобера (у спецыяльнай апрацоўцы для дзяцей), «Жыццё і прыгоды Розальда Амундсена», Якаўлева.

У друку і хутка выйдуць у свет «Ціль Уленшпігель», Шарль дэ Костэра, «Маугглі», Кіплінга, «Огнём», Войніч.

Рыхтуюцца да друку «Айвенго», Вальтэр Скотта, «Дон Кіхот», Сервантэса і «Пётр I», А. Талстога.

ФІЗКУЛЬТУРА

* 18 і 19 сакавіка ў Віцебску, Гомелі, Магілеве і Менску адбудуцца цяжкаатлетычныя спаборніцтвы.

* За перавыкананне кантрольных лічбаў па здачы норм комплекса «ГПА» па лыжах прэзідыум ВСФКВ прэміраваў калектывы фізкультурнікаў. Магілеўская шаўковая фабрыка, Гомсельмаша, і віцебская фабрыка «Сцяг Індустрыялізацыі».

* З 16-га сакавіка ў Менску праводзіцца гарадскія спаборніцтвы па гімнастыцы.

* У Віцебску будуецца новы гарадскі стадыён коштам каля 2 млн. рублёў. Новы стадыён будзе пабудаваны таксама на Віцебскай фабрыцы «Сцяг Індустрыялізацыі».

МЕНСКАЯ ЦЭЦ ПУШЧАНА

Фота КАПЛІНСКАГА.

На здымках, зверху ўніз: мітынг на пляцоўцы ЦЭЦ. На трыбуне начальнік будаўніцтва ЦЭЦ т. Ставшэнка. Выступленне намесніка старшыні СНК БССР т. СААК'ЯНА.

ХРОНІКА

* ДОМ АДПАЧЫНКУ для ўдарнікаў сістэмы спажывецкай каапераціы на 250-300 чалавек адкрываецца ў БССР.

* ГАРАДСКАЯ КАНФЕРЭНЦЫЯ ЎДАРНІКАЎ прадпрыемстваў будматэрыялаў і работнікаў навукова-даследчага інстытута прамысловасці адкрываецца сёння ў Менску, у Доме тэхнікі.

* НОВЫ ЦЭХ па выпрацоўцы з адыходаў бульбы сырога крухмалу абсталёўваецца на Магілеўскім плодасушыльным заводзе.

* Тав. КУЛАГІН Н. М. зацверджан СНК правадзейным членам Акадэміі Навук.

* НОВЫ ДАШКОЛЬНЫ ТЭХНІКУМ будуецца ў Менску. Прэзідыум ЦВК БССР абавязаў будкантору закончыць будаўніцтва да 1-га верасня б. г.

* ВЕЧАР-КАНЦЭРТ памяці А. В. ЛУНАЧАРСКАГА будзе наладжан у саканку ў Беларускай дзяржаўнай кансерваторыі. Прадстаўнік Акадэміі навук Беларусі зробіць даклад на тэму «Луначарскі аб музыцы».

Паведамленні

15 сакавіка ў 6 гадз. вечара адбудзецца лекцыя тав. Квірынга (дырэктара інстытута эканомікі Комакадэміі) на тэму: «Прамысловасць у другой пяцігодцы» для актыву гаспадарнікаў, совецкіх і іншых работнікаў— членаў партыі.

На гэтым-жа сходзе будзе абмеркавана пытанне аб вучобе актыву і рэарганізацыі дома Комасветы.

Менгарком КП(б)Б.

Наступныя таварышы, выдзеленыя ўпаўнаважанымі гаркома КП(б)Б па сельсоветах і калгасах для правядзення 2-дзесяніка праверкі гатоўнасці каня да пасеўнай кампаніі (15-га і 16-га сакавіка), павінны з'явіцца 14-га сакавіка а 12-й гадз. дня ў Дом Комасветы (малая зала) для інструктажа:

Войцак (горсовет), Свірыдаў (Кам. па перасял.), Юдзін (горжылсаюз), Надзёжын (райспажыўсаюз), Андрэеў (зав. імя Варашылава), Жыгун (горсовет АСО), Турэцкі (горсовет), Казакоў (гарана), Фрайнт, Левін (шчотачная фабрыка), Галкоўскі (ГК ЛКСМБ), Каменецкі (электрастанцыя), Лыскоў (горшэфтаварыства), Казлоўскі (друк. імя Сталіна), Еленеўскі (гарфа), Гарабцоў (зав. «Комунар»), Казачонак (пажарная ахова), Галавач (фабрыка «Окцябр»), Парачынскі (зав. «Большавік»), Гольдберг (фабрыка імя Фрунзе), Маняевіч (лямпавая фабрыка), Івашкевіч (Мінбуд), Гуревіч (нарсуд 1-га уч.), Капялевіч (горсовет), Каган (МГРЮ), Масюк, Раўтовіч (гарком ЛКСМБ), Мароз (горЗА), Неспер (кам. заготовак), Левбовіч (гарснаб), Цукерман (кам. узаемадапамогі), Слоўш («Чырвоны абутнік»), Окунь (хімлес), Масляніскі (ГСПС), Рубенчык (зав. імя Молатова), Фесько (ГК ЛКСМБ), Гельфанд (гаргазбюро), Старавойтаў (ВКСПШБ), Белазоўскі (саюз шафераў), Вадейка (групком працаспетаў), Мончаж (грамадскае харчаван.), Велікаселец (фабрыка-кухня), Левін (ЦП саюза будаўнікоў), Юдовіч (ЦП саюза мясарыба), Кравец (наргасвучот), Іарайцель (клінічны гарадок), Фрыдляндз (гарком каапераціі), Горфінкель (гаслоўліт), Турэцкіч (Белкаапсаюз), Заяцаў (гарком КП(б)Б), Заполь (Плодагародтрэст), Немірскі (Кар. Кам. аховы здароўя), Ефімаў (Белдзяржкіно), Чарток (Белдзяржснаб), Брэнейзен (горпракуратура), Маслоў (сель-гас. УПР), Казыроўскі (Молпрамтрэст), Папоў (рэд. «Калгасн. Беларусі»).

ЗАГАД

па Народнаму камісарыяту асветы БССР

11 сакавіка 1934 г. г. Менск

1. Прыняць у аснову інструкцыю НКАсветы РСФСР аб правядзенні праверачных іспытанняў у пачатковай і сярэдняй школе з дадаткамі і зменамі, унесенымі школьным кіраўніцтвам НК Асветы БССР.

2. Прапанаваць усім загадчыкам гор- і райана безадкладна па атрыманні гэтай інструкцыі давесці яе да кожнай пачатковай і сярэдняй школы.

3. Абавязаць усіх школьных інструктароў-метадыстаў дасканала азнаёміцца з інструкцыяй і безадкладна прыступіць да растлумачальнай работы сярод загадчыкаў школ, загадчыкаў навучальных частак і настаўнікаў аб парадку правядзення праверачных іспытанняў у школе.

4. Абавязаць усіх загадчыкаў школ на працягу сакавіка азнаёміць вучняў і бацькоў з характарам, з месцам і парадкам надыходзячых праверачных іспытанняў.

5. У адпаведнасці з пунктам 6 інструкцыі загадчыкам школ мець на ўвазе ў навучальнай рабоце школы ў 2-м паўгоддзі паўтарэнне асноўных раздзелаў пройдзенага вучэбнага матэрыяла і арганізацыю сістэматычнай дапамогі адстаючым вучням.

6. Усім гор- і райана не пазней 5 мая г. г. разаслаць па сельсоветах інструктароў-метадыстаў і вопытных метадыстаў настаўнікаў узорных школ, ПКМ, ФЗС для аказання дапамогі ў справе арганізацыі і правядзення праверачных іспытанняў забяспечыць у час іспытанняў кожную школу афіцыяльным прадстаўніком раёна.

7. Школьнаму праўленню НКАсветы не пазней 5 мая разаслаць у раёны сваіх прадстаўнікоў у дапамогу горраёнам па арганізацыі і правядзенню праверачных іспытанняў.

Народны Камісар Асветы БССР ЧАРНУШЭВІЧ.

Адказны рэдактар Г. Н. БРАГІНСКІ.

Гукавы кіно-тэатр „Чырвоная зорка"
ПРЭМ'ЕРА! ПАРУЧЫК КІЖЭ
У праграме гукавая кіно-хроніка

КІНО ПРОЛЕТАРЫЯ
4-я заключная серыя ВОСТРАЎ ТАЙГА
Дзіцячы Гукавы кіно-тэатр
Мастацкі гістарычны фільм з эпохі парыжскай камуны ЛЮЛЬКА КОМУНАРА
У праграме гукавая хроніка

КІНО Інтэрнацыянал
Мастацкі замежны фільм КАХАННЕ ІСПАНІІ

КІНО „СПАРТАК" З 14 сакавіка ЗАМЕЖНЫ ФІЛЬМ
„РЭЎНАСЦЬ"
драма ў 6 частках
У галоўнай ролі Ліа-дэ-Пуці і Вернер Краўс.
У праграме кіно-хроніка Беларускі № 54
Штодзённа 5 сеансаў. Пачатак у 6, 7-15, 8-30, 9-45, 11. Каса—з-4 гадзін.

МЕНСКІ БЕЛПЕДТЭХНІКУМ
ДАДАТКОВА НАБІРАЕ КУРСАНТАЎ
на 6-месячныя рускія педкурсы.
Прымаюцца асобы маючыя веды за 7 груп.
Да заявы патрэбна прыляпіць давед кі: аб соцпаходжанні і соцстановішчы, аб адукацыі, узросце і здароўі.
Курсанты забяспечваюцца інтэрнатам, сталовай і стыпендыяй у памеры 50 р.
Заявы дасылаюцца да 20 сакавіка па адрасу: Менск, Совецкая, 107.
Дырэкцыя.

МЕНСКАЕ ГОРБЮРО САЮЗДРУКУ
даводзіць да ведама прадпрыемстваў устаноў і індывідуальных падпісчыкаў г. Менска і раёна, што з сакавіка месяца падпіска на газеты і журналы
ПРАВОДЗІЦЦА ВЫКЛЮЧНА ПА КВІТАНЦЫЯХ З ПЯЧАТКАЙ ГОРБЮРО САЮЗДРУКУ.
За здадзеную падпіску па квітанцыі без пячаткі горбюро Саюздруку адказнасці не нясе.
Менгорбюро Саюздруку.

Менскі аўтадарожны тэхнікум Галоўдарпрэса БССР
абвяшчае НАБОР
на пяцімесячныя падрыхтоўчыя курсы ў тэхнікум на 120 асоб: 60 асоб з адрывам ад вытворчасці (дзённыя) і 60—без адрыву (вячэрнія)
НА КУРСЫ прымаюцца рабочыя і іх дзеці, калгаснікі і інш. працоўныя па ўзросце ад 16 да 30 год, з асветай 6—7 груп сямігодкі (перавага даецца работнікам аўтадарожнага будаўніцтва).
Курсанты з адрывам ад вытворчасці забяспечваюцца стыпендыяй ад 30 да 40 р. у месяц, інтэрнатам і сталоўкай.
Да заявы далучыць аперацыйную анкету, метрычную даведку, даведку аб асвеце, соцпаходжанні і становішчы бацькоў і пастаўляючага, даведку аб працы, калі працуе; аб адносінах да ваеннай павінасці, дзве фотакарткі і марак на 40 к для адказу.
Аб залічэнні і часе заняткаў на курсах будзе паведамлена поштай.
Прыём заяў—да 25 сакавіка.
Дакументы накіроўваць па адрасу: Менск, Студзёнцкі завулак 3, аўтадарожнаму тэхнікуму.
Дырэкцыя.

ПЕРШЫ УСЕБЕЛАРУСКІ З'ЕЗД РАЁННЫХ ПЛАНАВЫХ КАМІСІЙ
адкрываецца 15 САКАВІКА, у 6 г. веч., у памяшк. гал. кор. Універсітэцк. гарадка, III паверх, ауд. 302
ПАРАДАК ДНЯ:
1. Вынікі работы над планам 1934 г. і задача райпланавых камісій.
2. Метадалогія планавання асноўных галін народнай гаспадаркі ў раёне.
3. Складанне плана 2-ой пяцігодкі і задачы райпланаў.
4. Арганізацыйныя пытанні работы райпланаў.
Па ўсіх пытаннях з'езда і за атрыманнем мандатаў звяртацца ў Дзяржплан, Дом урада, V паверх, пакой 531, тэл. 22-6-73.
Дзяржплан БССР.

КУРСЫ ВОСУ
арганізуюць
2 групы БУХГАЛЬТАРОЎ і адну групу ПЛАНАВІКОЎ
для рабочай сістэмы „БЕЛКООПРАМСОВЕТА".
Стыпендыя ад 100 да 150 руб. і кватэрных 25 руб. у месяц.
Інтэрнатам курсанты не забяспечваюцца.
Прымаюцца рахунковыя пра цаўнікі са стажам не менш 1 года. Да заяў дадаць дакументы: аб соцпаходжанні, адукацыі (7 груп), працоўным стажы, узросце (не менш 18 год), адносінах да ваеннай службы, вызваленне ад арошнага месца працы і марак на 40 кап. для адказу.
Заявы падаваць у канцылярыю ВОСУ (Менск, Рэволюцыйная, 3, ва двары) ДА 25 САКАВІКА, ад 12 да 2-х гадз. дня.
Аб прыёме будзе паведамлена поштай. Заявы без пералічаных дакументаў разглядацца не будуць.

Заняткі курсаў калгасных і соўгасных гарманістаў, балалаечнікаў, запявал, заціўнікаў і кіраўнікоў музычных гурткоў, арганізуемых Наркамасветы БССР, пачнуцца 20 сакавіка г. г.
Прапануецца загадчыкам раёнаў забяспечыць своечасовы прыезд курсантаў у г. Менск згодна раней разасланых развёрстак.
Гарманістам і балалаечнікам прыехаць са сваімі інструментамі
Н-Асветы БССР.

Меняю пакой 22 кв. м., сонечны, у раёне школы АБВШ, на два пакоі або на адзін большы ў любым раёне, але абавязкова недалёка ад трамвая. Звяніць па тэл 21-66.

Нарсуд 1. уч. г. Менска абвяшчае грамадскае ганьбаванне гр. ШУБ Мейке Мендзелевай (вул. Берсона, 9—3), згодна прыгавору суда ад 27-га кастрычніка 1933 г. па арт. 196 К.К.

ПРАДАЎЖАЕЦЦА
ПРЫЁМ ПАДПІСКІ З 1-IV-34 г.
„ОГОНЁК" — двухтыднёвы масавы грамадска-палітычны, ілюстраваны журнал пад рэдакцыяй Міх. Кальцова.
Падпісная цана: 12 мес. — 6 руб., 8 мес. — 3 руб., 3 мес. — 1 р. 50 к.
„РОСТ" — двухтыдні вы масавы літаратурна - мастацкі журнал, які асвятляе пытанні масавага літуху і вядзе работу з маладымі пісьменнікамі.
Падпісная цана: 12 мес. — 12 руб., 6 мес. — 6 руб., 3 мес. — 3 руб.
„ЖИЗНЬ ЗАМЕЧАТЕЛЬНЫХ ЛЮДЕЙ" — 2-я серыя біяграфій пры ближэйшым удзеле М. Горкага.
У 1934 годзе будуць выданы біяграфіі Жэлябава, Вагнера, Бальзака, Вольтэра, Магелана, Эдысона, Лермантава, Салтыкова-Шчэдрына, Франкліна, Ульрыха фон Гутэн, Чэхава, Леанардо да-Вінчы, Лангтона, Бебеля, Бессемера, Радзішчава, Форда, Нераса, Майера і інш.
Падпісная цана: 12 мес. (24 кн.) — 25 р. 20 к., 6 мес. (12 кн.)—12 р. 60 к. 3 мес. (6 кн.)—6 р. 30 к.
Падпіска прымаецца: Масква, 6, Страстной бульвар, 11 „Жургазаб'яднанне" і ўсюды поштай і аддзяленнямі Саюздруку.
ЖУРГАЗАБ'ЯДНАННЕ.

Рэдакцыя газеты „ЗВЯЗДА" просіць усіх аўтараў пісьмаў заметак абавязкова паказваць сваё прозвішча імя і імя па бацьку і дакладны паштовы адрас.

Нарсуд 2-га уч. г. Менска абвяшчае грамадскае ганьбаванне гр-на СВІРНОЎСКАМУ Іосіфу Абрамаву (Раваўская 6—18), згодна прыгавору суда ад 19.XII.33 г. па арт. 196 К.К.

Менск, друкарня «Звязды».

Упаўн. Галоўлітбела № К—2499